© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")

Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK

Printing Office: Buchdruckerei der Apostolischen Visitatur, München 8, Rosenheimer Straße 46a. — Telefon-Nr. 45 81 43

Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA"
München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 50 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 7-8 (86-87) Нядзеля, 24 лютага 1952 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 6

Маячаньні аб вялікай Польшчы

У вартыкуле «Імпэрыялістычныя паляганьні палякаў» («Бацькаўшчына» № 5 (83) мы зьвярнулі ўвагу на тое, што ў сувязі із што раз сільнейшымі дамаганьнямі немцаў звароту іхніх усходніх земляў, што пасьля апошняй вайны адыйшлі да Польшчы, у польскай эміграцыйнай прэсе ўзмоцнілася кампанія за прывярненьне Польшчы Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны, якімі яна ўладала да 1939 г. З двух цікавых артыкулаў на гэтую тэму: «Пяты разьдзел Польшчы» Ст. Стронскага («Остатне Вядомосьці» за 20. I. 52) і «За новы падыход да справаў Усходніх Земляў» Ст. Скшыпэка («Бюлетынь Польскі» за 1. I. 52 і 15. I. 52), мы тады спыніліся лькі над першым, паказаўшы ўсю беспадстаўнасьць аўтаравай аргумэнтацыі.

Сяньня займемся разглядам артыкулу другога. Вось-жа, як тады было зазначана, Ст. Стронскі свае патрабаваньні звароту земляў Польшчы стараўся абгрунтаваць аргумэнтамі міжнароднага права, якія, на ягоны пагляд, зьяўляюцца вартасьцю нязьменнай і вечна абавязваючай. У дапаўненьне да ягоных разважаньняў, Ст. Скшыпэк даказвае правы палякаў на нашыя заходнія землі іхным станам фактычным. Паколькі аргумэнты Ст. Стронскага былі слабымі, настолькі Ст. Скшыпэка яшчэ слабейшыя. Над імі можа й ня варта было-б спыняцца. Але паколькі польскія эмігранты заўсёды й усюды імі апэруць, варта й іх паддаць аб'ектыўнай рытыцы, каб у рукі менш зарыентаванага ў гэтай справе нашага грамадзянства даць моцныя контраргумэнты.

Спасярод цэлага раду аўтаравых аргумэнтаў выбярэм толькі тыя, якія, каб яны аказаліся праўдзівымі, маглі-б дмацоўваць аўтараву тэзу. Апусьцім гое ўсе ягоныя чыста суб'ектыўныя рытэрыі, як, прыкладам, цьверджаньне, што біялягічная сіла польскага народу будзе яшчэ дастатковая, каб паляі змаглі праглынуць гэтыя тэрыторыі, г. п.

ГІСТАРЫЧНЫЯ МАЯЧАНЬНІ

Аўтар цьвердзіць, што заходня-беларускія й заходня-украінскія землі былі жо ад часоў раньняга сераднявечча з ацыянальнага гледзішча мяшанымі. алі ходзіць пра Заходнюю Беларусь, о, апіраючыся на хронікі XIV ст., ён аўважае, што ўжо за часоў Гэдыміна ыло там значнае польскае асадніцтва, кое рэкрутавалася з ваенна-палонных. эты польскі элемэнт меў зь бегам часу авялічвацца так, што пасьля вуніі між Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчаю вытварылася там узапраўдная нацыянальная мазаіка (?!).

Гэты аргумэнт, бясспрэчна, ня вытрымлівае ніякае крытыкі. Той факт, што ўжо за часоў Гэдыміна было на Беларусі польскае асадніцтва, абсалютна яшчэ нічога не гаворыць. Мы гэтаму зусім не пярэчым, але адначасна цьвердзім, што былі гэта паасобныя рэдкія польскія асады, якія расплываліся ў беларускім этнаграфічным моры й праўдападобна хутка асыміляваліся. У тыя часы, у выніку частых войнаў, ува ўсіх краёх Эўропы былі пасяляныя ваеннапалонныя, з чаго яднак зусім ня вынікае, каб на гэтай падставе рабіць цяпер да дадзенае тэрыторыі нейкія прэтэнсыі. Апрача палякаў, на Беларусі за часоў Вітаўта было таксама паселена многа татараў, якія захавалі сваю нацыянальную сьведамасьць і сваю рэлігію й да сяньня. Але іх было так мала, што абсалютна ня могуць яны мець нейкага ўплыву на агульную колькасьць насельніцтва нашага краю. А паводля ўсіх гістарычных дадзеных ваеннапалонных палякаў на Беларусі да часоў вуніі напэўна было меней, чымсьці татараў, з каторымі вяліся часьцейшыя войны. Ды напасьледак факт пасяляньня ваеннапалонных быў у тыя часы зусім натуральным зьявішчам, бо ня існаваў яшчэ звычай вымены ваеннапалонных.

Што пасьля вуніяў між Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчаю, асабліва пасьля Люблінскае вуніі пранікаў на Беларусь польскі элемэнт — гэта факт. Аднак і тады этнічны польскі элемэнт на Беларусі бясспрэчна быў так нязначны, што наагул нельга яго тут браць пад увагу. Затое дзякуючы польскім культурным уплывам паступова палянізавалася беларускае магнацтва й пазьней шляхта, што ўжо ў XIX ст. абодвы гэтыя слаі насельніцтва, паза дробнымі выключэньнямі, сталіся зусім польскімі.

Але й гэта яшчэ не дае абсалютна ніякіх аб'ектыўных падставаў цьвердзіць, што наш край прадстаўляў у той час «запраўдную нацыянальную мазаіку». Гэтая «мазаіка» ў Польшчы была тады значна большая, куды пранікнуў сільны нямецкі элемэнт.

Гэты спалянізаваны элемэнт, хаця колькасна нязначны, мог мець рашаючае значэньне ў тыя часы, калі сялянскія масы, якія пад польскія ўплывы абсалютна не падпалі, яшчэ не адыгрывалі ніякае ролі. Пры гэтым трэба не забывацца, што, дзякуючы бальшавіцкай палітыцы, элемэнт гэты зь беларускіх земляў ужо шчэз. Але калі-б ён і захаваўся, дык ягонае значэньне было-б мінімальнае пры сяньняшняй палітычнай актыўнасьці сялянства.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД НАСЕЛЬНІЦТВА ПЕРАД ВАЙНОЙ І СЯНЬНЯ

Бясспрэчна вырашаючае значэньне мае нацыянальны склад насельніцтва ў дадзеную пару. І тут, калі абапёрціся на тых статыстычных дадзеных, якімі апэруе аўтар, дык у значнай меры трэба было-б зь ім згадзіцца. Ён падае, што ў 1931 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны нацыянальны склад насельніцтва быў наступны: З 11,7 мільёнаў насельніцтва (аўтар бярэ пад увагу толькі сем ваяводзтваў, тады калі ўзапраўднасьці было восем зь няпольскім насельніцтвам), што пражывала на гэтай тэрыторыі, было: палякаў — 4,7 мільёнаў (40,4%), украінцаў — 4,2 міл. (36,6%), беларусаў — 1 міл. (9%), летувісаў — 80 тысячаў (0,7%), рэшта прыпадала на жыдоў і іншых.

Гэтыя дадзеныя ўзятыя аўтарам з польскага перапісу насельніцтва 1931 г. Але ў працэсе хвальшаваньня фактаў, у чым палякі былі незраўнанымі майстрамі, калі хадзіла пра нацыянальныя справы, гэты перапіс біў рэкорд. Прыкладам на Беларусі, — гавару із собскага дасьветчаньня — беларускае нанельніцтва ў пераважаючай меры было запісванае палякамі або прымусова, як, прыкладам беларускія каталікі, або пад узьдзейваньнем застрашваньня й паліцыйнага тэрору. Дзякуючы гэтаму беларусаў у Заходняй Беларусі з паўтара мільёна, якіх было паводля першага сьпісу насельніцтва ў 1921 г., — а гэты сьпіс быў таксама тэндэнцыйны й не паказваў навет палавіны беларусаў — атрымаўся ў 1931 няпоўны мільён. І гэта тады, калі нацыянальная сьведамасьць беларускага сялянства не памяншалася, але павялічвалася.

Што абодвы сьпісы насельніцтва ў дачыненьні да беларусаў былі на столькі хвальшывымі, сьветчыць факт, што больш салідныя палякі саромяцца ім паслугоўвацца й зусім не бяруць за аснову пры устанаўленьні нацыянальнага складу насельніцтва Заходняй Беларусі. Гэтак В. Вельгорскі — былі дырэктар Віленскага Інстытуту Дасьледваньня Ўсходніх Справаў — у сваей брашуры «Беларускі народ сярод сваіх суседзяў» (Лёндан, 1949, рататарнае выданьне) зусім не бярэ пад увагу ані першага ані другога перапісу. Ён, апіраючыся на расейскім перапісе з 1897 г. і нямецкім перапісе з 1916 г., праведзеным нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй г. зв. «Обэр-Ост», ды карыгуючы пры гэтым польскія статыстыкі, уважае, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі было ў 1939 г. 2.300.000—2.350.000 беларусаў. Ужо гэтая колькасьць становіць абсалютную перавагу ў нашую карысьць, бо ўсяго насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі было ў тым часе каля чатырох мільёнаў чалавек.

Але перапіс з 1897 г. і навет перапіс з 1916 г. маюць яшчэ вартасьць вельмі адносную. У 1897 г. беларуская сялянская маса была яшчэ нацыянальна нясьведамай, а ў 1916 г. нацыянальная сьведамасьць, асабліва сярод каталікоў, была таксама недастатковай. Працэс нацыянальнага ўсьведамленьня беларускага сялянства адбываўся паміж першай і другой сусьветнай вайной. Зважаючы на гэта, можна сьмела ўважаць, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі пражывала ў 1939 г. каля трох з палавінаю мільёнаў беларусаў. Прынамсі гэтак падаюць савецкія жаролы, якім беларускай тэндэнцыі закінуць нельга. Калі-ж узяць пад увагу, што на тэрыторыі ўсяе Беларусі, у тым ліку і ў заходняй, жыла вялікая колькасьць жыдоў, дык прыходзім да вываду, што працэнт палякаў, уключаючы сюды й элемэнт насланы: адміністрацыю, спалянізаванае мяшчанства, вайсковых асаднікаў і г. п., быў даволі нізкі.

Гэткі быў стан да 1939 г. А як-жа тады ёсьць сяньня?

Як ведама, падчас трох вывазаў насельніцтва зь Беларусі ў 1940-41 г. г., праводжаных бальшавікамі, быў высланы куды большы працэнт палякаў чымсьці беларусаў прапарцыянальна да агульнае колькасьці насельніцтва краіны. Гэта было не таму, што палякаў бальшавікі больш прасьледвалі, але таму толькі, што гэта былі амаль выключна буйныя земляўласьнікі, вайсковыя асаднікі, паліцыянты ды вышэйшыя ўрадаўцы, якія падлягалі вывазу ў першую чаргу. Пасьля-ж апошняе вайны ўсе палякі, як ведама, былі прымусова выселеныя зь Беларусі ў Польшчу. Таму зьяўляецца незапярэчным фактам, што на тэрыторыі Беларусі палякаў сяньня няма зусім.

Гэтыя вывазы й персасяленьні Ст. Скшыпэк называе «актамі гвалту». Гэтак называем іх і мы. І мы абсалютна ня супраць таго, каб пасьля зьнішчэньня бальшавізму ўзноў вярнуліся на Беларусь усе тыя палякі, якія былі карэннымі яе жыхарамі. Але калі ходзіць пра элемэнт насланы у вапошні час, дык, ясна, месца яму там, адкуль ён прыбыў.

Згодна савецкай статыстыкі з 1939 г., калі БССР ужо ўключала ў сябе й Заходнюю Беларусь, на тэрыторыі ўсяе Беларусі было беларусаў 92,8%. Таму трэба ўважаць, што калі-б і вярнуліся на Беларусь выселеныя зь яе палякі, дык гэты працэнт значна зьмяніцца ня мог-бы.

Такім чынам уся Беларусь, у тым ліку й ейная заходняя частка, з гледзішча на нацыянальны склад насельніцтва прадстаўляе сабой, пры вельмі нязначнай колькасьці нацыянальных мяншыняў, адналітую беларускую тэрыторыю. Таму аб ніякай «нацыянальнай мазаіцы» гаварыць ня прыходзіцца, а вышэй пададзеныя вывады Ст. Скшыпэка трэба аднесьці да ягоных фантастычных маячаньняў, да якіх асабліва здольныя палякі.

(Заканчэньне на 3 балоне)

Вялікабрытанія у жалобе

У сераду 6 лютага сёлета ўвесь сьвет абегла вестка, што «Яго Вялікасьць Кароль Вялікабрытаніі, Ірляндыі, заморскіх дамініяў, абароньнік веры, пратэктар Англіканскай Царквы», — як гучыць афіцыяльны тытул — 56-летні Рыгор VI адыйшоў на вечны супачынак.

Пасьля гэтага на вялікабрытанскі трон узыйшла 26-летняя дачка памёршага караля — Альжбета II.

Сьмерць караля Рыгора VI пакрыла глыбокай жалобай увесь ангельскі народ і народы ўсяго брытанскага каманвэльту.

Манархія, як форма дзяржаўнага ладу, сяньня, можна сказаць, ужо належыць да мінуўшчыні. А сваім пачаткам яна сягае ў няпамятныя часы старажытнасьці. Бо як далёка ў мінуўшчыню сягае гісторыя, усюды й заўсёды на чале дзяржавы стаяў манарх, ня гледзячы на тое, якім тытулам называлі яго падданыя.

Із самых старых часоў уважалася, што ўлада манарха паходзіць ад Бога, а некаторыя старажытныя народы лічылі яго навет напалавіну Богам, напалавіну чалавекам. Гэтае надпрыроднае паходжаньне манаршае ўлады вызнала навет Хрысьціянства, калі агульна ўважалася, што манарх — гэта Божы памазанік.

Апошні пэрыяд гісторыі, які прынёс кардынальныя зьмены ў жыцьці чалавецтва, даканаў таксама грунтоўную перабудову й у сыстэме дзяржаўнага ладу. Манархія ўступіла месца сыстэме рэспубліканскай. Найвялікшы ўдар прынесла сыстэме манархічнага ладу першая сусьветная вайна. Пасьля яе ў цывілізаваным сьвеце, асабліва ў Эўропе ўжо асталося вельмі мала каралеўстваў, дый тыя, што яшчэ асталіся, з году ў год зьнікалі ў выніку розных дзяржаўных забурэньняў. Ня гледзячы на гэта, ня знойдзецца бадай ніводнага ангельца, які-б уважаў, што ў ягонай краіне клясычнага дэмакратызму можа ў гэтых дачыненьнях нешта зьмяніцца, што на чале дзяржавы ня будзе болей караля. Агульна гаворыцца, што калі-б навет у Вялікабрытаніі настаў камуністычны лад, то ён не паважыўся-б пасягнуць на каралеўскую сьвятасьць — кароль астаўся-б і надалей.

Дык у чым-жа тады крыецца гэтая нязвычайная павага каралеўскае асобы ў Вялікабрытаніі й надпрыродная сіла каралеўскага аўтарытэту? Ці ў магутнасьці ягонай улады, ці ў чым іншым, яшчэ глыбейшым?

Кароль Вялікабрытаніі поводля канстытуцыі абсалютна ніякае ня мае палітычнае ўлады. Ен з гэтага гледзішча зьяўляецца ўнікатам спасярод усіх манархаў, якія калі-небудзь былі й якія яшчэ асталіся сяньня. Ен ня мае права выдаваць ані навет прапанаваць аніякіх законаў. Ен зь дзяржаўнага бюджэту ня можа выдаць аніводнага пэнса.

Уся заканадаўчая ўлада ў Вялікабрытаніі спачывае ў руках парляманту, а выканаўчая — у руках ураду на чале з прэм'ерам, які звычайна зьяўляецца лідэрам партыі, што мае бальшыню ў парлямэнце. Кароль толькі адчытвае на кажнай гадавой сэсыі парляманту праграму ўраду, якую піша ня ён сам, але прэм'ер. У гэтай прамове кароль выказвае не сваю думку, але думку народу, выслаўленую ў парлямантарнай бальшыні.

У прыватным жыцьці ён звычайны чалавек. Ен карыстаецца тымі самымі правамі, што й кажны брытанскі грамадзянін. Калі пасьля апошняй вайны ён зьвярнуўся да магістрату Лёндану з просьбаю аб прыдзеле невялікае колькасьці цэмэнту для рамонту пашкоджанага бомбамі ягонага палацу, яму ў гэтым было адмоўлена. Падчас вайны ён змушаны быў задаволіцца тым самым прадуктовым пайком, што й звычайны лёнданскі работнік.

Паміма ўсяго гэтага кароль зьяўляецца найвышэйшым рэпрэзэнтантам брытанскае ўлады. Аўтарытэт ягонае асобы ёсьць нязвычайна вялікі й незапярэчны. Яму аддае пашану кажны брытанскі грамадзянін бяз розьніцы на сваю партыйную прыналежнасьць, палітычныя пагляды й сацыяльнае паходжаньне. Кажны ангелец можа сьмела крытыкаваць свой урад, але асоба караля знаходзіцца паза ўсякай крытыкай.

Магутнасьць каралеўскага становішча й ягоны аўтарытэт спачываюць не на палітычных, але на маральных і псыхалягічных асновах. Кароль — увасабленьне брытанскае магутнасьці, ейнае багатае традыцыі й глыбокае духовасьці, гэта сымбаль брытанскага каманвэльту. Каралеўскі аўтарытэт зьяўляецца тэй вялікай ідэйнай і маральнай сілай, якая злучае ў вадно цэлае ўсе часьці брытанскае імпэрыі.

Такім, а ня іншым, разумее свайго караля кажны брытанец.

Дык і ня дзіва, што ягоная перадчасная сьмерць пакрыла глыбокай жалобай усю Вялікабрытанію. Ня дзіва тады, што кажны брытанец адчувае ў душы сваей найвялікшы смутак па страце ўлюбленага караля — найвялікшага й першага грамадзяніна Вялікабрытаніі.

Таму й мы беларусы далучаемся да гэтага смутку брытанскага народу й выказваем яму сваё глыбокае спачуваньне.

І мы за Цэнтр

Пасьля таго, калі спробы стварэньня г. зв. СОНР-у праваліліся, у расейскіх колах розных палітычных кірункаў пачалося шуканьне вінаватых, што мелі прычыніцца да гэтага правалу. Як і трэба было спадзявацца, іх доўга шукаць ня прышлося. У ўяўленьнях расейцаў аказаліся імі рознага роду «самостийники» й «сепаратисты», г. зн. нацыянальныя прадстаўнікі ўсіх нерасейскіх народаў, што не захацелі згадзіцца на запрапанаваную расейцамі нацыянальную праграму СОНР-у, інакш кажучы, не захацелі пайсьці на собскае самагубства.

На падмацаваньне свайго становішча, некаторыя расейскія колы пачалі сярод эмігрантаў розных нацыянальнасьцяў у розных краінах зьбіраць падпісы пад дамаганьнямі стварэньня ўсё-ж такі гэтага СОНР-у, зразумела, на запрапанаванай раней расейцамі нацыянальнай базе. Гэтак ведамая расейская газэта «Голос Народа» выпусьціла за 10 лютага навет спэцыяльнае выданьне, запоўненае выключна фотокопіямі такіх подпісаў і дамаганьняў. Там-жа зазначаецца, што зьбіраньне подпісаў прадаўжаецца. Там таксама зьмешчаны заклік, каб як найшырэйшыя колы эмігрантаў усіх нацыянальнасьцяў шляхам складаньня такіх подпісаў дамагаліся безадкладнага стварэньня СОНР-у. І ў некаторых з гэтых дамаганьняў таксама паказваецца пальцам, што ўва ўсім вінаватыя тыя-ж «сэпаратыстыя», а нейкі адзін «кровный берорусс» — шахцёр з Бэльгіі ад імяні дваццацёх іншых навет заяўляе, што ён правёў чуць ня ўсё сваё жыцьцё ў Менску, Магілёве й іншых акругах Беларусі, але ніколі «не наблюдал этой преславутой тяги к самостийности».

Што-ж, і гэтакіх беларусаў знайсьці можна.

Мэта зьбіраньня гэтых подпісаў і падобных заяваў, як заява «кровного белорусса», ясная. Ходзіць про тое, каб паказаць, што нерасейскія народы ніякай дзяржаўнай незалежнасьці не жадаюць і жадаць ня думаюць, што нацыянальнае пытаньне ў Савецкім Саюзе зусім ня існуе, а зьяўляецца толькі выдумкай кучкі інтэлігенцыі — «сэпаратыстых», што такім чынам яны, гэтыя «сэпаратыстыя» й вінаватыя за развал СОНР-у.

Хітрэй прыдумаць нельга! Але глянем-жа на справу паважна й паглядзім, хто ўзапраўды вінаваты, што ня можа дагэтуль стварыцца супольны фронт змаганьня супраць бальшавізму.

Мы ані чуць ня сумляваемся, што хто-небудзь зь нерасейскіх нацыянальнасьцяў ня хоча гэтага супольнага фронту змаганьня. Мы ня сумляваемся таксама, што ня хочаць яго й нацыянальныя прадстаўніцтвы тых народаў, якія навет адмовіліся былі пайсьці на перагаворы з расейцамі ў справе супрацоўніцтва зь імі на нацыянальнай базе СОНР-у.

Наадварот, мы ўважаем, што для посьпеху змаганьня з бальшавізмам і хутчэйшай над ім перамогі ёсьць неабходным, каб змаганьне гэтае вялося супольным скаардынаваным фронтам усіх паняволеных народаў, а ў тым ліку й народу расейскага. Але трэба ясна здаць сабе справу з таго, што ніводзін з паняволеных расейскім бальшавізмам народаў ніколі ня згодзіцца на тое, каб, ськінуўшы адно ярмо — бальшавіцкае, собскімі рукамі надзець сабе на шыю другое ярмо — расейскае, хоць-бы й менш было яно крывавае. А тая нацыянальная праграма, якую нам прапануюць расейцы й адступіць ад якой ані шагу не згадзіліся, і прыгатаўляе нам гэтае новае ярмо на будучыню.

Расейцы цьвердзілі й цьвердзяць, што яны зьяўляюцца ўзапраўднымі дэмакратамі ў нашырэйшым значэньні гэтага слова й што толькі на такой дэмакратычнай базе яны імкнуцца стварыць СОНР.

Але аб гэтым іхным сваяасаблівым дэмакратызме найбольш вымоўна сьветчаць тыя пункты іхнае нацыянальнае праграмы, якія былі прычынамі ўсіх разыходжаньняў між імі й нерасейскімі народамі. Пакінем у дадзеным выпадку на баку два пункты найбольш аснаўныя, як катэгарычная адмова расейцаў вызнаньня раўнапраўнасьці ў СОНР-ы для нерасейскіх ягоных партнэраў і справу народнага волявыяўленьня —

(Заканчэньне на 2 балоне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Узнагароды для заслужаных Беларусаў

Да беларускіх вайсковых і цывільных афіцэраў

Беларускі народ на шляху свайго вызвольнага змаганьня выдаў зь сябе вялічэзную колькасьць бліскучых постацяў нацыянальных гэрояў, змагароўволатаў.

Сталася неяк, што мы, беларусы, ідучы няўпынна і нястомна наперад, быццам, ня маючы часу аглядацца, не заўважаем і нічым не адзначаем гэтых вялікіх гэраічных учынкаў нашых змагароў.

У гэтым сэнсе таму мы беларусы былі выняткам з пасярод усіх народаў.

Дзеля таго, каб выраўняць гэтую крыўду як для самых гэрояў, так і для іх сем'яў, ды цэлага народу, прэз. Абрамчык устанавіў дэкрэтам 1 верасьня 1949 году тры (тымчасам) ордэры для ўзнагародаў як вайсковых, так і цывільных заслугаў.

У вызначаную прэзыдэнтам камісію для апрацоўкі статуту былі увайшлі: гэнэрал Ф. Кушаль, як старшыня, др. С. Грынкевіч, М. Т., магістр права Л. Галяк, мастак П. Мірановіч, як сябры камісьі.

Статуты для ўсіх 3-х ордэраў зацьверджаны прэзыдэнтам і ўвайшлі ў жыцьцё дня 5 жніўня 1951 г.

Да гэтага часу ўзнагароджаны прэзыдэнтам ордэрамі толькі наступныя асобы:

1) Гэнэрал М. Вітушка: Ордэрам Пагоні 3-й клясы і Ордэрам Зялезнага Рыцара 3-й клясы.
2) Гэнэрал У. Р.: Ордэрам Пагоні 3-й клясы і Ордэрам Зялезнага Рыцара 3-й клясы.
3) Маёр Саха: Ордэрам Зялезнага Рыцара 4-й клясы.
4) Маёр Іван Слуцкі: Ордэрам Зялезнага Рыцара 4-й клясы.
5) 3-ы Камандзіры асобных адзьдзелаў і адзін афіцэр сувязі:

Ордэрамі Зялезнага Рыцара 4-й клясы (усе на Бацькаўшчыне).

Нагароды ордэрам Мэдалю Партызана — будзе праводзіць Шэф Штабу беларускіх партызанаў.

Капітула (як толькі будзе ўканстытуаваная) займецца перадусім укладзеньнем сьпіску для нагародаў загінуўшых змагароў-гэрояў.

Статут ордэру Пагоні

Арт. 1. Устанаўляецца ордэр Пагоні з мэтаю ўзнагароджываньня выдатных цывільных ці вайсковых заслугаў у часе вайны ці міру, зробленых для славы і на карысьць Беларускага Народу.

Арт. 2. Ордэр Пагоні зьяўляецца найвышэйшым ганаровым адзначэньнем Беларускага Народу і надаецца асобам, якія выдатна спрычыніліся да здабыцьця незалежнасці, задзіночаньня ўсіх беларускі земляў, або да ўзмацаваньня незалежнасьці і росквіту беларускай дзяржавы.

Арт. 3. Знакамі ордэру Пагоні зьяўляюцца:

1) Крыж ордэру Пагоні.
) Зорка ордэру Пагоні.
3) Істужка ордэру Пагоні.

Арт. 4. Крыж ордэру Пагоні васьміканцовы, пакрыты эмаліяй, берагі залатыя ці серабраныя. На сярэдзіне крыжа залатая ці серабраная Пагоня. Адваротная старана гладкая з выбітым парадкавым нумарам ордэру. Крыж бывае трох вялічыняў: Вялікі Крыж ордэру Пагоні, Залаты Крыж ордэру Пагоні і Сярэбраны Крыж ордэру Пагоні.

Вялікі Крыж ордэру і Залаты Крыж з золата, Сярэбраны Крыж з серабра.

Арт. 5. Зорка Ордэру Пагоні сярэбраная. Складаецца з 8 пукоў прамяньняў. На сярэдзіне зоркі умешчаны крыж узору апісанага у арт. 4.

Арт. 6. Ордэрная істужка — нацыянальных коляраў (бел-чырвона-белы).

Арт. 7. Ордэр Пагоні дзеліцца на пяць клясаў. Азнакамі ордэру ў паасобных клясах зьяўляюцца:

1) У першай клясе Вялікі Крыж ордэру Пагоні, павешаны на шырокай істужцы ордэну Пагоні праз правае плячо на левы бок і Зорка ордэру на левым баку грудзей.

2) У другой клясе Вялікі Крыж ордэру Пагоні павешаны на ордэравай істужцы на шыі, а з правага боку грудзей Зорка ордэру Пагоні.

3) У трэцяй клясе Залаты Крыж ордэру Пагоні на ордэравай істужцы на шыі.

4) У чацьвертай клясе Залаты Крыж ордэру Пагоні на вузкай ордэравай істужцы зь левага боку грудзей.

5) У пятай клясе Сярэбраны Крыж ордэру Пагоні на вузкай ордэравай істужцы зь левага боку грудзей.

Узоры адзнакаў ордэру Пагоні апісаныя ў далучніку (глядзі рысунак).

Арт. 8. Ордэрам Пагоні могуць быць адзначаныя грамадзяне бяззаганнага характару, якія маюць асаблівыя заслугі перад Беларускім Народам.

Арт. 9. Прэзыдэнт Рады Б. Н. Р. зьяўляецца з тытулу свайго становішча кавалерам ордэру Пагоні першае клясы і зьяўляецца з ураду Вялікім Магістрам ордэру Пагоні і як такі зьяўляецца старшынёю капітулы ордэру Пагоні.

Арт. 10. Капітула ордэру Пагоні складаецца з трох асобаў і трох заступнікаў; усіх паклікае Вялікі Магістар ордэру з пасярод кавалераў ордэру на пяць гадоў.

Арт. 11. Капітула выбірае з пасярод сябе канцлера капітулы, які зьяўляецца заступнікам Вялікага Магістра ордэру Пагоні і сакратара.

Арт. 12. Капітула кіруе ўсімі справамі ордэру, прыгатаўляе праекты ўсіх распараджаньняў у справах ордэру і выдае сваю думку адносна кандыдатаў у кавалеры ордэру.

Арт. 13. Пастанова капітулы зьяўляецца важнай, калі прысутны канцлер капітулы і двух сяброў капітулы ці іх заступнікаў, калі сябры паведамілі аб немагчымасьці прыбыцьця.

Арт. 14. Ордэр надае Прэзыдэнт Рады Б. Н. Р. асобным дэкрэтам, у якім азначае заслугі, за якія надаецца ордэр.



КРЫЖ ОРДЭРУ ПАГОНІ

Арт. 15. Кандыдатаў у кавалеры ордэру Пагоні прадстаўляюць у 5 і 4 клясу міністры, а ў 2 і 3 клясу Рада Міністраў, засягнуўшы перад гэтым думку Капітулы, адносна маральных кваліфікацыяў кандыдата.

Арт. 16. Думка Капітулы адносна маральных кваліфікацыяў зьяўляецца аканчальнай.

Арт. 17. Прэзыдэнт Б. Н. Р. мае права надаваць ордэр і із сваёй собскай ініцыятывы, але арт. 16 абавязывае і ў гэткім выпадку.

Арт. 18. Чужынцы, якія маюць заслугі перад Беларускім Народам, могуць таксама атрымліваць ордэры ўсіх клясаў, але ня маюць права быць сябрамі Капітулы.

Арт. 19. Прапановы аб адзначэньні чужынцаў не патрабуюць пацьверджаньня капітулы.

Арт. 20. Перастае быць кавалерам ордэру Пагоні той, каго Капітула выключыць зь ліку кавалераў ордэру дзеля неганаровага ўчынку.

Арт. 21. Беларус адзначаны ордэрам Пагоні аплачвае кошты ордэру.

Арт. 22. Усе падрабязнасьці арганізацыі Капітулы будуць зьмешчаны ў асобным распараджэньні Прэз. Б. Н. Р.

Арт. 23. Гэтае распараджэньне ўваходзіць у жыцьцё дня 5 жніўня 1951 году.

Статут вайсковага ордэру „Зялезнага Рыцара"

Арт. 1. Устанаўляецца вайсковы ордэр «Зялезнага Рыцара» для адзначаньня ваенных ці вайсковых заслугаў.

Арт. 2. Азнакамі ордэру «Зялезнага Рыцара» зьяўляюцца:

а) Крыж ордэру «Зялезнага Рыцара».

б) Істужка ордэру «Зялезнага Рыцара».

Узоры і дакладныя разьмеры крыжоў «Зялезнага Рыцара», істужкі і зоркі знаходзяцца ў далучніку да гэтага распараджэньня.

Арт. 3. Вайсковы ордэр «Зялезнага Рыцара» дзеліцца на пяць клясаў. Адзнакамі ордэру ў паасобных клясах зьяўляюцца:

а) У першай клясе: Вялікі Крыж ордэру Зялезнага Рыцара, павешаны на шырокай ордэравай істужцы праз правае плячо на левы бок.

б) У другой клясе: Камандорскі Крыж ордэру Зялезнага Рыцара, меншы ад Вялікага Крыжа, ношаны на ордэравай істужцы на шыі.

в) У трэцяй клясе: Кавалерскі Крыж ордэру Зялезнага Рыцара, меншы за Камандорскі, ношаны таксама на шыі.

г) У чацьвертай клясе: Залаты Крыж ордэру Зялезнага Рыцара, ношаны зь левага боку грудзей.

д) У пятай клясе: Сярэбраны Крыж ордэру Зялезнага Рыцара, ношаны зь левага боку грудзей.

Арт. 4. Вайсковы ордэр Зялезнага Рыцара зьяўляецца ўзнагародай выдатных ваенных учынкаў і можа быць наданы:

1) Вялікі Крыж: галоўнакамандуючаму, за пераможную вайну, а ў часе міру камандуючаму арміі, ці за выдатную арганізацыйную працу.

2) Камандорскі Крыж — камандуючаму арміі ці вышэйшаму камандуючаму, а выняткова камандуючаму групы, дывізьіі ці раўнапраўнаму, за сьмелае і ініцыятыўнае вядзеньне ваеннай апэрацыі, якая мела значэньне для выніку вайны. Выняткава Камандорскі Крыж можа быць наданы афіцэру, які выдатна прычыніўся да перамогі.

3) Кавалерскі Крыж — камандуючаму аддзелу да арміі ўключна, за надзвычайныя баёвыя ўчынкі ці выдатную ініцыятыву, палучаную з умелым пасьпяховым камандаваньнем. Выняткова афіцэру штабу за супрацоўніцтва з камандуючым, калі гэтае супрацоўніцтва выдатна прычынілася да перамогі.

4) Залаты Крыж — жаўнеру, што мае ўжо Сярэбраны Крыж, за ўмелае камандаваньне аддзелам, да дывізьіі ўключна, ці за ўчынак выдатнай ініцыятывы, якая запэўніла ваенную ўдачу. Выняткава можа быць наданы жаўнеру, што ня мае яшчэ Сярэбранага Крыжа.

5) Сярэбраны Крыж — камандуючаму за сьмелы і ініцыятыўны баёвы ўчынак асаблівае адвагі, палучаны з умелым і пасьпяховым кіраваньнем, або жаўнеру, які сваім прыкладам уплынуў на сяброў да выдатнага баёвага ўчынку, ці за асабістую выдатную адвагу.

Сярэбраным Крыжам могуць быць таксама адзначаныя цывільныя асобы і зборныя адзінкі вайсковыя і цывільныя.

Арт. 5. Асобы адзначаныя ордэрам Зялезнага Рыцара маюць тытул кавалераў ордэру Зялезнага Рыцара адпаведнай клясы. Кавалеры ордэру Зялезнага Рыцара — грамадзяне, твораць грамаду кавалераў ордэру, на чале з капітулай.

Арт. 6. Кавалеры ордэру Зялезнага Рыцара маюць права першасьці да аддачы гонару із стараны вайсковых роўнае рангі, нямаючых ордэру і права да афіцэрскіх гонараў пры пасьпаваньні. Падафіцэр адзначаны ордэрам Зялезнага Рыцара можа быць прызначаны афіцэрам, а жаўнер сяржантам.

Арт. 7. Дзень сьвята ордэру ўстановіць капітула.

Арт. 8. Ордэр Зялезнага Рыцара надае галоўнакамандуючы, а падчас міру былы галоўнакамандуючы, калі-ж іх няма, дык найраней адзначаны адзін з кавалераў ордэру Зялезнага Рыцара, найвышэйшай ступені, выбраны капітулаю.

Арт. 9. Ордэры Зялезнага Рыцара 1, 2 і 3 клясы надаюцца на прапанову капітулы, а 4 і 5 клясы на прапанову камандуючага.

Права надаваньня Сярэбранага Крыжа можа быць перадана й камандуючаму арміі. Галоўнакамандуючаму надае ордэр Прэзыдэнт на прапанову капітулы.

Арт. 10. Капітула ордэру Зялезнага Рыцара паклікаецца на пяць гадоў галоўнакамандуючым і складаецца з кавалераў першай клясы і 8 сяброў, па 2 з кажнай клясы. Старшыня капітулы вызначаецца на 2 гады галоўнакамандуючым з пасярод кавалераў 1 ці 2 клясы. Заступніка выбірае капітула з пасярод кавалераў 1, 2 ці 3 клясы. Пры нястачы кавалераў вышэйшых клясаў вызначаюцца адпаведна кавалеры нізэйшай клясы.

Арт. 11. Капітула кіруе ўсімі справамі ордэру, прыгатаўляе праекты ўсіх распараджэньняў у справах ордэру.

Арт. 12. Перастае быць кавалерам ордэру Зялезнага Рыцара той, каго капітула выключыць зь ліку кавалераў ордэру З. Р. дзеля неганаровага ўчынку.

Арт. 13. Усе кошты зьвязаныя з наданьнем ардэру З. Р. паносіць Скарб.



КРЫЖ ЗЯЛЕЗНАГА РЫЦАРА

Арт. 14. У свой час будуць выданыя асобныя правілы аб асаблівых правох кавалераў ордэру Зялезнага Рыцара.

Арт. 15. Тымчасова правы галоўнакамандуючага і капітулы выконывае Прэзыдэнт Рады Б. Н. Р.

Арт. 16. Гэтае распараджэньне ўваходзіць у жыцьцё дня 5 жніўня 1951 г.

Крыж Зялезнага Рыцара

Чатырох-канцовы крыж, пасярэдзіне крыжа дзьве скрыжаваныя шаблі. На раменьнях крыжа літары Б. Н. Р. Адваротны бок ордэну, як ліцавы, але бяз літараў Б. Н. Р. і бяз шабляў, выбіты парадкавы нумар ордару.

Першая кляса — крыж і шаблі залатыя, другая кляса — крыж сярэбраны, берагі і шаблі залатыя. Трэцяя кляса — крыж і шаблі серабраныя. Пятая кляса — крыж і шаблі бронзавыя.

Істужка Крыжа Зялезнага Рыцара: чырвонага (цёмнага) й зямельнага (бурага) колеру, зложаная трохкутнікам. На йстужцы дзьве скрыжаваныя шаблі, такія-ж як і на ордару.

Статут ордеру Мэдаль Партызана

1. Мэдаль Партызана надаецца Прэзыдэнтам Б. Н. Р. беларусам, якія змагаліся ў радох Беларускай Нацыянальнай



МЭДАЛЬ ПАРТЫЗАНА

Партызанкі за Незалежнасьць Беларусі супроць акупантаў нашай Радзімы.

2. Мэдаль Партызана надаецца на прапанову партызанцкага штабу камандзірам партызанцкіх адзьдзелаў і на прапанову камандзіраў партызанцкіх адзьдзелаў праз партызанцкі штаб кажнаму партызану.

3. Мэдаль Партызана Першай Ступені надаецца Камандзірам Адзьдзелаў і Начальнікам штабаў Адзьдзелаў. Мэдаль другой ступені кажнаму партызану.

Мэдаль Партызана Першай Ступені можа атрымаць кажны партызан за выдатныя баявыя заслугі.

4. Мэдаль Партызана Першай Ступені ўся залатая, на ліцавым баку выбітыя дзьве скрыжаваныя стрэльбы і літары Б. Н. Р., на адваротным баку выбіты дэвіз: За Бацькаўшчыну.

Мэдаль Партызана другой ступені сярэбраная, рэшта, як першая ступень. Істужка Мэдалю Партызана трох колераў: Чырвона-зямельна-зялёная зложаная трохкутнікам. На істужцы першай ступені дзьве скрыжаваныя стрэльбы. (Глядзі рысунак.)

5 Гэтае распараджэньне увайходзіць у жыцьцё дня 5 жніўня 1951 г.

Свая арганізацыя у першую чаргу

Прэзыдыюму 6-га Агульнага Гадавога Зьезду Саюзу Беларусаў у Бэльгіі быў пераданы ліст наступнага зьместу:

«Дарагія Сябры! Мы, беларусы і ўкраінцы, з нагоды жанімства маладое беларускае пары: сп-ра Швэда Пятра і сп-ні Кузьменкі Зофіі, зь ініцыятывы сп. Галабурды Івана складаем ахвяры на карысьць СББ у суме 1.157 б. франкаў і жадаем Вам шмат посьпехаў у працы».

Ахвяры злажылі:	фр.
сп. Галабурда Іван	50,—
сп. Чэрвацюк Сьцяпан	50,—
сп. Войцік Мікалай	100,—
сп. Страшэўскі Віктар	30,—
сп. Кіцюм Пятро	50,—
сп. Ляшчук Сяргей	60,—
сп. Маторны Васіль з жонкаю	50,—
сп. Бойчук Міхайла	40,—
сп. Кузьменка Язэп	100,—
сп. Зубараў Уладзімер	50,—
сп. Новік Ігнат	30,—
сп. Швэд Пятро	500,—
сп. Сьмірноў Васіль	47,—

Шчырае беларускае дзякуй усім ахвярадальнікам за так эфэктоўную падтрымку беларускае арганізацыі. Маладой-жа пары жадаем шмат шчасьця й посьпехаў у ейным сямейным жыцьці.

Прэзыдыюм Зьезду

І мы за Цэнтр

(Заканчэньне)

плебісцыту. Спынімся над пунктам іншым, які на першы пагляд, здавалася-б зьяўляецца справай чыста фармальнай і ня маючай большага значэньня, але які ў сутнасьці сваей шмат аб чым гаворыць. Гэта справа назвы — Саюз Вызваленьня Народаў Расеі. Накідаць згары нерасейскім народам назву **народаў Расеі** зьяўляецца для апошніх справай ня толькі абразьлівай, але хавае ў сабе й палітычны сэнс. Гэта сьветчыць, што расейцы ў сваім імпэрыялістычным шале навет і ў гэтым намагаюцца заакцэнтаваць сваё будучае права на ўсе нерасейскія народы. І падчас Вісбадэнскай нарады, як ведама, яны й слухаць не хацелі, каб із назвы супольнае арганізацыі слова гэтае было выкінутае.

Упярэджаньне й недавер нерасейскіх народаў да расейцаў, якія бясспрэчна й сяньня маюць месца, зьяўляюцца зусім зразумелымі й управядліўленымі. Гэты недавер зьяўляецца поўнасьцю ўмотываваным як мамэнтамі гістарычнымі, г так і сучаснымі. Усе нерасейскія народы, падбітыя на працягу стагодзьдзяў расейскімі царамі, зьяўляліся ўвесь ч аб'ектам жорсткай экспляатацыі й бе аглядная русыфікацыі. На пряцягу ўсяе гісторыі ў Расеі не паявіўся ніводзін палітычны кірунак, які-б асудзіў захопніцкую імпэрыялістычную палітыку й выступіў у вабароне паняволеных народаў. Не паявіўся такі кірунак і сяньня.

Ня гледзячы аднак на ўсё гэта, нерасейскія народы ў ваблічы найвялікшага ворага ўсяго чалавецтва — бальшавізму згадзіліся-б пайсьці на супрацоўніцтва з расейцамі з мэтаю стварэньня супольнага фронту змаганьня. Расейцы-ж із свайго боку павінны былі-б казаць свой антыімпэрыялізм і адмовіцца ад усяго таго, што нерасейскім народам было накінута прымусам, што прыносіла й прыносіць ім толькі крыўду.

Тымчасам сярод эміграцыйных расейскіх палітыкаў мы нічога падобнага ня бачым. Дык дзе-ж тады подставы для супольнага супрацоўніцтва й для здабыцьця нашага даверу, які можа быць найгалаўнейшай перадумовай гэтага супрацоўніцтва? Хто-ж тады паносіць віну за тое, што не ўдалося стварыць супольнага з расейцамі фронту дзеля змаганьня з бальшавізмам?

Вінаваціць ува ўсім гэтым нацыянальныя прадстаўніцтвы нерасейскіх народаў ёсьць простым ськідваньнем віны з хворае галавы на здаровую. такое паступаньне расейцаў трэба н зваць у найлепшым выпадку непаважным.

Алесь Крыга

Новая расейская „калыханка"

Якіх толькі аргумэнтаў ня ўжыва расейцы супраць «самостийников», «с паратистов», «национал-шовинистов», ў вапошнім часе — «расчленителей»!

Але ў вапошнім часе яны ўжо не казваюць, што «не было, нет и быть может», бо сяньня ўвесь вольны сьв што раз больш пачынае разумець, ш змаганьне супраць бальшавізму, як р жыму, будзе заўсёды толькі поўмера калі яно ня будзе ўключаць у сваю пр граму змаганьня з расейскім імпэры лізмам наагул, а таксама змаганьня вызваленьне народаў.

Гэтую думку заходняга сьвету відаць хоць-бы із спробы Амэрыканскага Камітэту стварыць нейкі больш менш дэмакратычны супольны фронт змаганьня з бальшавізмам, фронт, што, апрача расейцаў, меў-бы ўключаць у сябе й нерасейскія народы. І вось пасьля доўгіх радовых мукаў і быў паложаны пачатак такога фронту ў форме г. зв СОНР-у, які перадчасна мусіў аднак зыйсьці ў магілу ад звычайнай расейскай хваробы — вялікадзяржаўя.

Пасьля сьмерці гэтага штучнага твору расейскі «дэмакраты» запелі зусім іншую калыханку.

У вапошніх нумарох «Нового Русского Слова», што выходзіць у Нью Ёрку, зьмяшчаецца шмат артыкулаў аўтараў розных палітычных кірункаў, у я разглядаецца нацыянальнае пытаньне ў будучай Расеі. У гэтых артыкулах ужо не даказваецца беспадстаўнасьці нацыянальных патрабаваньняў. У іх адчуваецца больш рамантычны тон. Папросту аўтары іх стараюцца ўгаварыць усяму сьвету, што ніякага нацыянальнага прыгнёту, а тым больш гэносыдызму ніколі ня было ані ў царскай Расеі ані ў сучасным СССР. Далей яны даводзяць, што і ў царскай Расеі і ў СССР расейскі народ цярпеў таксама, а можа яшчэ й больш за іншыя народы.

Прыкладам, у вадказ аднаму ўкраінскаму журналістаму, які даводзіў, што пры пабудове Пецярбурга загінула шмат украінцаў, рэдактар «НРС» Вайнбаўм адказаў, што пры пабудове таго-ж Пецярбурга й Таганрогу загінула шмат

(Заканчэньне на 5 балоне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Маячаньні аб вялікай Польшчы

(Заканчэньне)

АБ Г. ЗВ. КУЛЬТУРНАЙ МІСІІ

Ст. Скшыпэк у сваім артыкуле між іншым піша: «Хаця палякі не тварылі абсалютнай бальшыні на гэтых землях, аднак іхная роля, нацыянальная дасьпеласьць, культурныя й гаспадарскія дасягненьні гавораць за тым, што маюць яны права ўважаць Усходнія Землі за частку сваеі большай бацькаўшчыны й цьверджаньне, быццам бы беларусы, украінцы й летувісы мелі большыя правы да гэтых земляў, неабаснаванае. Гісторыя асудзіла гэтыя народы на сужыцьцё з палякамі, і ніводзін зь іх ня мае права ўважаць палякаў, што жывуць на гэтых землях, за элемэнт прыбылы, ніводзін зь іх ня мае таксама падставаў уважаць сябе за выключнага гаспадара гэтых земляў».

Вось тут дык ужо польскі аўтар і завяршыў.

Тое, што палякі маюць большую нацыянальную дасьпеласьць, мае даць ім права панаваць над намі?! У такім выпадку немцы, якіх перад 1939 г. на тэрыторыі заходняй Польшчы было куды болей, чымсьці палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, мелі-б яшчэ большае права да Заходняй Польшчы, не гаворачы ўжо аб польскіх «земях одзысканых». Такімі аргумэнтамі апэруюць сяньня польскія захопнікі!

Што-ж тычыцца польскага культурнага й гаспадарскага «доробку» на нашых землях, дык мы з гэтым згаджаемся. Усе буйныя зямельныя собсьнікі былі палякі — ці то мясцовая спалянізаваная шляхта, зі каляністыя. Але іх-жа сяньня няма. А калі-б і вярнуліся, дык няўжо думае аўтар адбудоўваць іхныя буйныя зямельныя лятыфундыі ці насыляць на гэтыя землі польскіх асаднікаў, перамяняючы беларусаў у батракоў?

Культурны «доробэк» палякаў быў, праўда, даволі высокі, але да часоў адбудовы незалежнай Польшчы быў ён толькі для палякаў, бо беларускае насельніцтва зь яго не карыстала. Беларускі народ імкнуўся разьвіваць собскую нацыянальную культуру, якая, асабліва ў першых гадох пасьля першай сусьветнай вайны разьвівалася надзвычайна буйна.

Калі-ж ходзіць пра прывіваньне нашаму насельніцтву «вышэйшае» польскае культуры, дык адбывалася яно шляхам прымусовым пры выдатным улзеле адміністрацыі й паліцыйнага штыха.

І вось над гэтым пытаньнем нельга тут коратка ня спыніцца. Імкненьнем палякаў у адроджанай Польшчы была палянізацыя няпольскіх народаў, што папалі ў ейныя межы. Ані немцаў ані жыдоў паляніэаваць яны ня зьбіраліся. Цяжкаватая была справа таксама з украінцамі, якіх у межах Польшчы была значная колькасьць і якіх нацыянальная сьпеласьць і актыўнасьць была на высокім узроўні. Таму, пасьля няўдалых палянізатарскіх спробаў, палякі былі змушаны пагадзіцца з фактам, што ўкраінцаў спалянізаваць усё-ж такі ня ўдасца. Гэта прымусіла палякаў зь імі, хоць часткава, лічыцца.

Затое была пастаўленая стаўка на беларусаў, якія й папалі поўнасьцю пад абух палянізацыі. Яшчэ ў першых гадох існаваньня незалежнай Польшчы тагачасны міністар Сікорскі быў афіцыяльна заявіў у сойме, што за 50 год у межах Польшчы ня знойдзеш беларуса ізь сьвечкай. І па гэтай лініі йшла пасьлядоўна ўся далейшая польская літыка.

Вось некалькі вымоўных фактаў. Як мы ўжо ўспаміналі, польская статыстыка з 1921 г. паказвала паўтара мільёна беларусаў, а 10 год пазьней — ужо ня цэлы мільён. Толькі на тэрыторыі г. зв. «Сярэдняй Літвы», што абыймала ўсяго частку Заходняй Беларусі, існавала на пачатку звыш 400 беларускіх пачаткавых школаў, а ў 1939 г. — аніводнай у цэлай Заходняй Беларусі. На пачатку ў польскім парляманце было 15 беларускіх паслоў і сэнатараў, а ў 1939 г. — аніводнага. На пачатку былі ў Заходняй Беларусі 4 беларускія гімназыі й дзьве вучыцельскія сэмінарыі, а ў 1939 г. — аніводнай. На пачатку выходзіла ў Вільні некалькі беларускіх газэтаў і часапісаў, а ў 1939 г. — аніводнай. Беларуская мова ў каталіцкіх касьцёлах неафіцыяльна, але фактычна была забароненая, а ў праваслаўных цэрквах усякімі спосабамі заводзілася мова польская й хвабрыкаваліся г. зв. «праваслаўныя палякі», а на Палесьсі — «тутэйшыя». У прыгранічнай паласе, якая абыймала 100 клм., «ненадзейным» беларусам было забаронена купляць землі, а пад рубрыку «ненадзейных» падводзіліся ў адміністрацыйным парадку ўсе хоць-бы чуць актыўныя з нацыянальнага гледзішча беларускія сяляне. Уся польская адміністрацыя, паліцыя, школа, каталіцкі касьцёл, а ў значнай меры й праваслаўная царква былі пастаўленыя на службу палянізацыі.

Гэтак прыгатаўляўся грунт для польскага культурнага «доробку» ў Заходняй Беларусі.

Аднак беларускі народ у межах Польшчы здаў нацыянальны эгзамен. Бо калі ў 1939 г. развалілася Польшча, дык у Заходняй Беларусі ад польскага культурнага «доробку» не асталося й сьледу. Ён, як штучна накінуты вонкавы пакост, шчэз бясьсьледна.

* * *

Такім чынам палякі ня маюць абсалютна ніякіх аргумэнтаў ані падставаў для захопніцкага пасяганьня на заходня-беларускія землі. Усе тыя аргумэнты, якія яны выстаўляюць, гавораць не за іх, але супраць іх.

Праўда, адзін адзіны аргумэнт на прывярненьне да Польшчы Заходняй Беларусі могуць высунуць палякі, і ён бяспрэчна адыгрывае тут важную ролю, хоць габарыць аб ім адкрыта не выпадае. Гэта аргумэнт псыхалягічны — простае, ні на якіх аб'ектыўных асновах не абапёртае жаданьне мець за ўсякую цану нашыя заходнія землі. Але гэта можна ўжо аднесьці да сфэры паэзыі, зь якой, як ведама, палітыка ня лічыцца.

Заходняя Беларусь зьяўляецца інтэгральнай часткай беларускай тэрыторыі й толькі беларускі народ мае да яе незапярэчнае права.

Язэп Каранеўскі

Сытуацыя ў Беларусі

АД РЭДАКЦЫІ: У мінулым годзе Лёндонскае Радыё ў польскім сэктары перадало зьмястоўны артыкул сп. Вальтэра Коляжа аб сытуацыі ў Беларусі, абапёрты, як відаць, на грунтоўных дедзеных, узятых із савецкай прэсы. Дзеля таго, што артыкул гэты зьмяшчае рад цікавых фактаў аб насыўным супраціве беларускага сялянства, перадрукоўваем ніжэй яго поўнасьцю:

Распаложаная між Летувай, Латвіяй, Польшчай, Украінай з аднаго боку й самой Расеяй — з другога, знаходзіцца дзяржава, налічваючая 10 мільёнаў жыхароў — Беларуская Савецкая Рэспубліка. Хаця Беларусь мае большае насельніцтва чымсьці прынамсі тузін эўрапэйскіх дзяржаваў, мала аднак можна пачуць пра яе праблемы — праблемы, якія на працягу некалькіх апошніх месяцаў прынесьлі цэнтральнаму савецкаму ўраду шмат клопатаў.

Беларусь зьяўляецца менш індустрыяльнай, чымсьці многа другіх частак Савецкага Саюзу, і таму труднасьці, якія мае рэжым, маюць у большыні сельскагаспадарскі характар. Гэтыя цяжкасьці паўсталі ў большай меры таму, што пяць акругаў з агульнага ліку дванаццаці, што ўключаюць блізу палавіну насельніцтва ўсей краіны — гэта новыя савецкія тэрыторыі, якія калісь належылі да ўсходняй Польшчы.

Там савецкі ўрад мусіць яшчэ закончыць поўную калектывізацыю, якая ў сучасны мамэнт выканана ад 85 да 95%. Але ўрад не чакаў навет на поўную кансалідацыю калгаснай сыстэмы ў Заходняй Беларусі. Ён кінуў сельскае насельніцтва ў поўнае замяшаньне, загадваючы рэарганізацыю й узбуйненьне гэтых, толькі што паўсталых пасьля цяжкіх мукаў, калгасаў.

На паперы справы ў Беларусі выглядаюць зусім добра. Краіна мае на сяньня толькі 3226 вялікіх калгасаў замест 9770 малых год таму назад. Гэтая драстычная рэдукцыя ў тэорыі дае магчымасьць для больш рацыянальнага выкарыстаньня карыснай зямлі, а таксама спрыяе камуністычнай партыі ў рабоце на вёсцы. Але беларускае сялянства не заахвоцілася савецкай аграрнай палітыкай. Паводля афіцыяльных савецкіх дадзеных відаць, што сяляне як Заходняй так і Ўсходняй Беларусі глядзяць на гэтыя ўрадавыя крокі з апатыяй і недаверам. Вельмі натужная й галаслівая прапагандавая кампанія была патрэбная дзеля таго, каб зьмяніць кірунак іхнай думкі.

Толькі ў студзені гэтага году Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі Беларусі выслаў у сельскія мясцовасьці 7676 агітатараў, якія прачыталі аж 12.500 дакладаў пра дасягненьні калектывізацыі. Даклады афіцыяльна мелі такія тэмы: «Супольная зямля — крыніца сілы калектыўнай гаспадаркі». Ужо сам загаловак дакладу гаварыў, што маюць сказаць калгасьнікам дакладчыкі. Яны мелі налягаць на тое, каб сяляне ня прывязвалі вялікага значэньня прыватным участкам зямлі, а больш прысьвячалі часу на працу на калектыўнай зямлі. Гэтая прапагандовая кампанія ня мела вялікага пасьпеху. Для выясьненьня такой сытуацыі мусіў быць скліканы Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі Беларусі ў пачатку сакавіка. Зараз пасьля заканчэньня канфэрэнцыі Цэнтральны Камітэт выняс нагану партыйным кіраўніцтвам чатырох акругаў (Берасьце, Баранавічы, Магілёў і Маладэчна) за тое, што яны не дагледзілі за лепшай прысутнасьцю калгасьнікаў на дакладах. У гэтым-жа часе Цэнтральны Камітэт пастанавіў арганізаваць у сельскіх мясцовасьцях другую масавую прапагандовую афэнзыву. Між 5 і 20 сакавіком тысячы агітатараў ізноў пачалі аб'яжджаць сельскія мясцовасьці з мэтаю выясьненьня карысьці ад узбуйненьня калгасаў, якія й так узбуйняліся без папярэдняга паразумленьня з масай сялянства.

Але, відаць, і гэтая другая кампанія ня прынесла жаданых вынікаў. Пасьля яе заканчэньня ворган ЦК Камуністычнай Партыі «Советская Белоруссия» пачаў узноў налягаць на патрэбу «сацыялістычнай дапамогі гораду калектыйнай гаспадарцы вёсцы» і «ўзмацненьня шэфства» гораду над сельскімі раёнамі. Форма «шэфства гораду над вёскай» ня была вынайдзеная ў 1951 г. Гэта стары спосаб, які быў ужываны ад самага пачатку калектывізацыйнага пэрыяду. Гэта прыпамінае дні, калі 25.000 гарадзкіх работнікаў-камуністых пайшло з Масквы й Ленінграду ў сельскія раёны, каб стацца там арганізатарамі й старшынямі калгасаў.

Да чаго фактычна зводзіцца гэтае шэфства? Гэта проста спосаб, у які камуністычныя элемэнты гарадзкога пралетарыяту пераймаюць кіраўніцтва сельскага жыцьця. Работнікі дадзенай хвабрыкі, якія пераймаюць шэфства над калгасам, адказваюць за палітычнае выхаваньне сяброў калгасу й яны павінны кіраваць імі пад кажным паглядам.

Можа нехта падумае, што такое «шэфства» належыць да мінуўшчыні. Але прыклад Беларусі паказвае, што гэта й надалей зьяўляецца галоўнай патрэбай камуністычнага панаваньня. У васаблівасьці ўзбуйненьне калгасаў праводзілася з дапамогаю «шэфствуючых» работнікаў гораду. Ужо ў мінулым годзе хвабрыкі й партыйныя арганізацыі Горадні, Віцебску, Менску й Гомеля пераняліе шэфства над калгасамі. Гэта быў толькі пачатак. Камуністыя на Беларусі пастанавілі распаўсюдзіць сыстэму шэфства як найшырэй, пры тым у першую чаргу бяруцца пад увагу тыя многія калгасы, якія навет пасьля ўзбуйненьня ня маюць аніводнага арганізаванага камуністага, а што-ж гаварыць пра камуністычную партыйную групу?

Зусім няма пэўнасьці, ці сыстэма шэфства створыць зь беларускіх сялян добрых калгасьнікаў, бо дараднікі й інструктары, якіх партыя выслала ў вёску, паказалі, што яны маюць слабыя здольнсьці. Беларуская прэса амаль штодзённа нападае на сельскую камуністычную бюракрацыю за нязручнасьць, а навет гультайства.

ЦК Камуністычнай Партыі Беларусі таксама мусіў заняцца гэтай справай. Камітэт публічна даў нагану кіраўніцтвам двух акругаў — Віцебскай і Пінскай — за папаўненьне «сур'ёзных памылак» пры падборы пэрсаналу, высланага ў сельскія раёны. Выглядае так, што партыйныя ўраднікі, якія былі непатрэбнымі ў гарадох, высылаліся ў сельскія мясцовасьці. Шмат ёсьць такіх «непатрэбных» ураднікаў у сталіцы Беларусі Менску. Сакратар менскай камуністычнай партыі Варвашэня заявіў на гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі 17 сакавіка, што 436 партыйных работнікаў было звольненых із сваіх становішчаў пераважна таму, што ня справіліся з даверанай ім работай. Тое самае адносіцца й да меншых гарадоў Беларусі. Прыкладам у Горадні 34 партыйныя работнікі былі звольненыя з работы за недастатковую працу.

Гэтыя зьмены пэрсаналу зьяўляюцца толькі часткай вялікай чысткі, якую распачаў першы сакратар Камуністычнай Партыі Беларусі Мікалай Патолічаў, які быў назначаны першым сакратаром у ліпені мінулага году. Патолічаў, які назначыў цэлы рад новых людзей на кіраўнічыя становішчы Беларусі, як у цэнтры, гэтак і на правінцыі, прыйшоў на Беларусь із спэцыяльным заданьнем палепшаньня сытуацыі ў беларускай калектыўнай гаспадарцы. Патолічаў узапраўды зьяўляецца адным з найлепшых сельскагаспадарскіх экспэртаў Крамля; ён навет быў намесьнікам старшыні па справах калгасаў пры ўрадзе СССР. Аднак да гэтага часу й Патолічаў ня выканаў паверaных яму ягонымі зьверхнікамі заданьняў.

ДА НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ І КАЛЬПАРТЭРАЎ

Ветліва просіцца ўсіх ахвярадаўцаў на «Белую Кнігу» і ахвярадаўцаў на Выдавецкі Фонд «Бацькаўшчыны» пры перасыланьні грошаў на тую ці іншую мэту далучаць адпаведныя пісьмовыя выясьненьні, пайменна:

1. Падаць вышыню перасыланай сумы й характар грашовых дэвізаў (фунт штэрлінгаў, франк французскі, даляр амэрыканскі ці канадзкі, чэк, паштовы пераказ і г. п.).

2. Назваць мэту, на якую грошы перасылаюцца (падпісная аплата за газэту, ахвяра на Выдавецкі Фонд «Бацькаўшчыны», ахвяра на «Белую Кнігу» й пад.).

3. Выразна падаць прозьвішча ці прозьвішчы, ад каго перасылаюцца грошы.

ДРАКОНСКІЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ЗА ЗЯЛЕЗНАЙ ЗАСЛОНАЙ

Як паведамляе Інфармацыйны Бюлетэнь «Лібэртас», мадзярскі камуністычны ўрад прадпрыняў драконскія меры з мэтаю паўстрымаць сваіх грамадзянаў ад уцеканьняў на Захад. Пачынаючы ад 1948 г. будуць усе сваякі да трэйцяй ступені ўключна тых асобаў, што ўцяклі на Захад, дэпартаваныя, а ў выключных выпадках узятыя пад паліцэйскі нагляд.

Гэтае распараджэньне мае быць сьцірванае таксама й супраць тых асобаў, якія будуць уважацца за адказных пры ўціканьні. Да такіх асобаў маюць належыць, прыкладам, старажы дамоў, якія маглі падазраваць прыгатаўленьні да ўціканьня, але ў час не паведамілі уладаў.

ЯКУБ КОЛАС

НОВАЯ ЗЯМЛЯ

ПАЭМА

IX

НОВЫ ЛЯСЬНІЧЫ

Якраз на самым расьсьвітаньні
Міхал вярнуўся з пахаваньня;
Вайшоў у хатку, распрануўся,
Зяхнуў і смачна пацягнуўся,
Бо цэлы дзень праталачыўся
І, ноч ня спаўшы, утаміўся;
І цела соладка нейк ныла, —
Ўсё адпачыць яго хіліла,
І жонка тут ня прыставала,
Пра сёе-тое распытала,
Ўздыхнула раз, другі па пану.
— Ну, сьпі, а я хіба ўжо ўстану. —
І маці стала адзявацца,
Каб за работу тую брацца;
Пайшла каровак падаіла
І бульбу сьвіням перамыла.

Тымчасам сонейка з-за лесу
Зьняло цямраную завесу.
Праменьні, стрэлы залатыя,
Макушку лесу прабіваюць
І блескам-зьзяньнем высьцілаюць
Нябёсаў багны патайныя.
Ў чародах сьветаў нязьлічоных
Нерасчытаных, неадмкнёных,
Людзкі наш лёс — былінка поля,
Пылок нязначны — наша доля,
А нашы радасьці і сьлёзы,
Надзеі сьветлыя, пагрозы
І ўсё, чым жыцьце нас вітае,
Яно адзначнасьці ня мае
У зьвязку гэтых сьветаў Божых,
Таемных, страшных і прыгожых;
І жыцьце пэўнаю ступою
Ідзе, ня ведае спакою,
Людзкіх пакутаў не адзначыць,
І страты іх яно ня бачыць.
— Эй, хлопцы, хлопчыкі! Ўставайце!
Кароў на пашу выганяйце!
Даўно пара ўжо пасьвіць стадка! —
Алеся, Ўладзю будзіць матка,
А хлопцы толькі ўзварухнуліся
І на другі бок павярнуліся.

Тут маці трошкі пастаяла
І галавою паківала:
Шкада будзіць — ох, сон салодкі!
Няхай пасьпяць яшчэ блазноткі.

Пагукваў дзядзька ўжо на полі
І ткаў сахою кросны-ролі,
Ды пырнік так укараніўся,
Што дзядзька з конікам таміўся,
І сошку часта ён спыняе,
І пырнік дзікі вытрасае.

— Ну-ж і балота! вось атрута,
То не работа мне — пакута:
Ступіў два крокі і спыняйся
Ды з гэтай пырніцай змагайся.

І як яны тут, ліха долі,
З сахой хадзілі ў гэтым полі?
Як тут расло на міласьць Бога,
Калі ў зямлю ня ўб'еш нарога?
Дзьве баразны прайшоў — конь
змогся . . .

Ну і народ, каб ён апрогся!
Так запусьціць зямлю нядбала?

Не гаспадар быў, а завала! —
Антось стаіць, штось разважае
І хмурна поле аглядае,
А потым раптам схамянуўся,

(7)

Зірнуў на сонца, ў двор рвануўся.
— Хіба каровы яшчэ дома?! —
Спаткаўшы Ганну, ён пытае,
Ідзе ў гумно і хлопцаў лае:
— Вы што зашыліся ў салому?
Ўставайце зараз гультаіны!

Прайшло, лічы, ўжо дзьве гадзіны,
Як сонца ў небе засьвяціла,
Яны-ж . . . хоць ты ўсадзі ім шыла ! . . .
Ўставайце жыва, а то ўскочу,
Устаць вас борзда заахвочу! —

Ўсхапілісь хлопцы і прыселі,
Ўстаюць з нагрэтае пасьцелі
І лапці зараз абуваюць.
За браму хлопцаў выпраўляюць.
Вось маці з хаткі выбягае,
Алесю торбу даручае,
А ў торбе хлеб і, пэўна сала,
І весялей шмат і хлопцам стала.

Калі ўжо сонейка прыгрэла,
Антось на полі кончыў дзела
І выпраг коніка сівога,
Свайго памоцніка старога.

Сівак зь вялікім здаваленьнем
Прайшоўся вольна загуменьнем
І, баючыся ашукацца,
Ральлю панюхаў, стаў качацца
З такім засосам і ахвотай,
Бакі намуляўшы работай.
Антось глядзеў і пацяшаўся
І ціха сам сабе сьмяяўся.

Ў дварэ, дзе колісь была хата,
Цяпер работа йшла заўзята;
Майстры-жыды ўжо зруб канчалі,
Гірш з Моўшам дошкі пілавалі;
Ніяк ня знойдуць яны скутку
І ўвесь дзень сварацца за дудку,
Пілою водзячы па брусу;
А гэту дудку на пакусу
Падараваў ім наш Антоні,
Дык Моўша зь Гіршам і сягоньня
За тую дудку ўсё грызуцца
І ледзь за пэйсы не бяруцца.

А Евель-Пеўнік з сваім сынам
Ужо пасьнедаў такім чынам,
Што й на нагах ён ня трымаўся,
Стагнаў у стружках і качаўся:
— Ой, гвалт, прапаў! ой, дух займае! —
Але ўсё-ж Айзіка пытае,
Які таксама зьеў ня ў меру:
— А што варыць нам на вячэру?
— Ты-б гэта выдыхаў, пражора!
Набраўся так, што й не ссапецца,
А за вячэру ўжо бярэцца —
І так «сяньнік» твой лопне скора! —
Антось да Евеля зьвярнуўся,
А Евель толькі усьміхнуўся
І зараз пеўнем абярнуўся:
Лоп-лоп рукамі. «Ку-ка-рэ-ку!»
Бо даў Бог талент чалавеку,
Якім ён часта выслаўляўся,
За што і «Пеўнікам» празваўся.
— Бадай ты спрогся! вось заводзіць! —
Антось ізь сьмехам адыходзіць,
Пад вусам сьмех яшчэ хавае,
Ідзе, Міхася сустрачае.

Міхась ужо крыху праспаўся,
Ў вабход сягоньня ня зьбіраўся.
Другія думкі і настроі
Ўсё не даюць яму спакою:
За кім лясьнцтва застанецца?

Адкуль і хто сюды прыпрэцца,
Пасаду вольную заступіць?
Карціць пытаньне гэта, рупіць.

Антось зь Міхалам на сьняданьні
Даюць адказы на пытаньні
І кандыдатаў разьбіраюць,
Адных пахваляць, тых палаюць,
— Вось каб Галонскі тут застаўся!

За ім бы, брат, палюдзкаваўся:
Такі прасьцяк, не падзіманы,
Лясьнічы вельмі-б пажаданы!

— Ды гэта так! — Міхал ўздыхае: —
Але заручкі ён ня мае:
Яго паны не падтрымаюць,
Бо на прымеце іншых маюць.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Распачынаючы турнэ па Бэльгіі

Першы канцэрт у Бруксэлі

Беларускі Студэнцкі Ансамбль пад кіраўніцтвам ведамага беларускаму грамадзтву прафэсара Менскай кансэрваторыі сп. Міколы Равенскага пачаў сваё турнэ па Бельгіі канцэртам, ладжаным у Бруксэлі ў нядзелю 10 лютага 1952 г. З уступным словам аб беларускіх студэнтах і Беларусі выступіў ведамы ўжо нашай эміграцыі вялікі прыяцель беларусоў айцец Робэрт Ван Кавэлерт.

«Каб зарыентаваць вас, паважаныя слухачы аб Беларусі, дык мушу сказаць, што ў мінулым гэны край называўся Вялікім Княствам Літоўскім. Думаю, што гэтым я сказаў шмат для ўсіх тых, хто ў меншай ці большай меры цікавіўся гісторыяй усходняй Эўропы. Многія з вас не уяўляюць розьніцы паміж расейцамі й беларусамі, дзякуючы якраз назову, накінутаму Кацярынай Вялікай, але мыляецца кажны так думаючы, як памыліцца той, хто скажа, што Галяндыя — гэта Нямеччына, а флямандзкая мова — гэта дыялект мовы нямецкай. Паказваючы на Ансамбль у прыгожых нацыянальных вопратках — вышываных кашулях і белых нагавіцах — гэта вось нашчадкі таго слаўнага Вялікага Княства Літоўскага. Яны сяньня тут, каб падрыхтаваць уваскрасеньне іхняе Бацькайшчыны, каб стварыць ідэйныя кадры будучага дзяржаўнага будавецтва.»

Грымяць ягоныя словы у перапоўненай па берагі канцэртнай залі. Слухае яго эліта Бруксэлі. Хвалююцца грудзі прысутных у залі беларусаў.

«...Смаленск, Менск, старая сталіца Вільня, Беласток, Берасьцe, Гомель, Магілёў, Віцебск — вось назовы, якія вы чулі ў вапошнім часе — гэта Беларусь», — прадаўжае а. Робэрт. Пасьля, пазнаёміўшы слухачоў з праграмай, а. Робэрт перадаў «слова» сп. праф. Равенскаму і ягоным годным яго гадунцом.

Паплылі чароўныя гукі «Малітвы», «Верую», «Іжэ Херувімы». Занямела заля. Цудоўная гармонія, прэцызыйнае выкананьне захапілі слухачоў. Бурныя аплядысмэнты сьветчаць аб уражаньні. Народныя танцы; Лявоніха й Крыжачок выклікаюць энтузыязм сярод гледачоў. Сп. Равенскага ня пускаюць із сцэны, хор мусіць сьпяваць на біс, бо бурныя воплескі, тупат нагамі, воклікі «біс» ня сьціхаюць. Незацёртае ўражаньне робіць на гледачоў таночны ансамбль, дакамплектаваны дзьвюма маладымі гімназісткамі, прыбыўшымі з Францыі ў нядаўна арганізаваны дзявочы інтэрнат у Лювэне, дзякуючы стараньням ЦБАА і а. Робэрта — нястомнага ў працы для дабра беларускага народу. Салёвы выступ сп. Сенькоўскага ўдала ўразнастайніў праграму першай часткі канцэрту.

У другой частцы др. Лыслаў выканаў «Суіту» для піаніна Праф. Равенскага, якая здабыла прызнаньне лепшых знатакоў музыкі.

«У гэтай Суіце» — кажа адзін — я чую вашую Беларусь, я яе ўяўляю.» — І ўзапраўды, слухаючы яе, перад вачыма перасоўваюцца прыгожыя і родныя нашаму сэрцу беларускія абразы, мэлёдыі...

Варыяцыі др. Лыслава на фальклёрныя тэмы, у якіх, хаця і адчуваецца ўжо маленькі ўплыў мадэрнай заходняй паважнай музыкі, аднак пакідаюць па сабе прыемнае ўражаньне. Надзвычай удалае выкананьне песьняў: «Чалавек жонку б'е» і «Маю грошы, маю я» — гэнае апошняе з апэрэты «Залёты» Праф. Равенскага, сп. Цьвіркам, выклікае нясьціхаючую буру воплескаў. Асаблівае ўражаньне выклікалі народныя песьні — «Ой вяду бяду», «Бабка», «Слуцкія ткачыхі», «Чаму-ж мне ня пець», — усе ў вапрацоўцы сп. Равенскага.

Я першы раз бачыў такі энтузыязм слухачоў — чужынцаў на імпрэзах, ладжаных палітычнымі ўцекачамі розных нацыянальнасьцяў. Хор паўтараў па некалькі разоў «Слуцкія ткачыхі», «Бяду»,

АЙЦЕЦ РОБЭРТ РОБІЦЬ ГІСТАРЫЧНЫ НАРЫС АБ БЕЛАРУСІ

«Бабку», «Пагоню», якой зьмест і гістарычнае значэньне паясьніў слухачом а. Робэрт — укаранавала гэны канцэрт, як першы з пачатай сэрыі. Хор, зышойшы ўжо із сцэны, быў змушаны вярнуцца, каб прасьпяваць яшчэ раз «Пагоню».

Надзвычай удала выкананай «Мяцеліцай» быў закончаны выступ.

Пасьля гарачых слоў падзякі ад імя прысутных, публіка спантанічна клікнула тройчы «Гура!» за беларускіх студэнтаў і іхнага апякуна а. Робэрта.

Выступ быў зарганізаваны дзеля азнаямленьня бэльгійскіх школаў зь беларускай народнай музыкай і песьняй.

У далейшым намечаныя канцэнтры ў Бруксэлі ў вадной з найвялікшых канцэртных заляў (2000 месцаў), Малін, Лювэн, пасьля ў Францыі.

У міжчасе пачата нагрываньне грамафонных плітак.

Пасьля гэтага ўсяго нам астаецца злажыць гарачую падзяку сп. Прафэсару Равенскаму за ягоную няўтомную працу, нашым студэнтам за іхнюю ахвярнасьць і а. Робэрту — нашаму прыяцелю і душы лювэнскай грамады.

А. С.

Другі канцэрт у Бруксэлі

У нядзелю 18 лютага б. г. ў залі Каледжу Сант. Мішэль у Бруксэлі Беларускім Студэнцкім Ансамблем Песьні і Танцаў пад кіраўніцтвам сп. камп. М. Равенскага, быў наладжаны канцэрт, арганізаваны бэльгійскай арганізацыяй моладзі «Franche Cordée». А гадзіне 8 вечара даволі вялікая заля запоўнілася па берагі. Празь дзірачкі ў заслоне бачу паміж слухачамі колькі прафэсараў, прадстаўнікоў музычнага сьвету, людзей вышэйшых грамадзкіх бэльгійскіх кругоў, шмат студэнтаў, шмат знаёмых беларусаў і чужынцаў.

Айцец Робэрт ван Кавэлерт — апякун беларускае студэнцкае групы ў Лювэне, ведамы ўжо шырэй беларускаму грамадзтву на эміграцыі — у сваёй уводнай 20-ці хвіліннай прамове коратка пазнаёміў слухачоў зь гісторыяй і геаграфіяй Беларусі, сяньняшнім палажэньнем беларускага народу і ягоных палітычных імкненьнях, у вельмі пахвальных словах схарактарызаваў працу Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне, як на ўнівэрсытэцкім, так і на сацыяльна-грамадзкім полі дзейнасьці. Відаць было з воплескаў, якімі некалькі разоў перарывалася ягоная прамова, што ўсе сымпатыі слухачоў па нашым баку.

Пасьля, у беларускіх вышываных кашулях, з тканымі паясамі, у бялюсенькіх, як сьнег, портках, з двух бакоў на сцэну, адзін за другім, паяўляюцца харыстыя, сп. камп. М. Равенскі на канцы. На залі абсалютная цішыня. Выступ пачынаецца беларускім рэлігійным гымнам «Малітва» на словы Арсеньневай. Далей ідуць рэлігійныя песьні «Верую», «Іжэ Херувімы» і «Достойно». Бура воплескаў пасьля кажнай песьні сьветчыла аб высокім мастацкім выкананьні.

Далей пачынаецца рэпэртуар беларускіх народных песьняў. За піянінам сядзіць др. І. Лыслаў. «Хмель лугамі», «Хамілон», «Пасею гурочкі». Харыстыя, праводжаныя незамаўкаючымі воплескамі, парадкам пакідаюць сцэну.

«Лявоніха»! З-за сцэны хутка выскакваюць 4 пары танцораў, вясёлых, зь мілымі ўсьмешкамі на тварах, у прыгожых народных вопратках. Іх выкананьне ёсьць беззаганным. Рытмічнасьць рухаў, разнастайнасьць фігураў танцу, дакладнасьць іх выкананьня, сымпатычнасьць усьмешак і наканец жывая маладосьць танцорак зачароўваюць гледачоў. Іх я абсэрвую з майго папярэдняга становішча, бачу і сам вычуваю іх захапленьне, якое хутка выліваецца ў імпэратыўнае «біс». Усьлед, калі ўжо адгрымелі воплескі пасьля паўторанай «Лявоніхі», студ. І. Сенькоўскі выконвае солё — два рамансы: «Мая тайна» і «Восень».

На сцэне ізноў паяўляецца хор, які гэтым разам ужо сустракаецца «бравам». Сьпяваюцца «Камар», «Вечарком», «Паласа» й «Вярба». «Паласа» паўторваецца на біс. Першая частка канцэрту закончваецца другім народным танцам — «Крыжачком», які ізноў-жа на настойлівае дамаганьне гледачоў мусіць паўторвацца. На сцэну паяўляецца адзін з арганізатараў канцэрту і, дзякуючы ўсім удзельнікам, заявіў, што гэты вечар ёсьць падвалінаю будучага «Таварыства Бэльгійска-Беларускае Прыязьні». Гэтыя словы ўспрыймаюцца прысутнымі бэльгійцамі доўгімі воплескамі.

За сцэнай «артыстыя» падмацоўваюцца хто сандвічамі, хто півам, а хто мо' і чым больш — дзеля адвагі. На залі-ж у міжчасе ізноў разлягаюцца мэлёдыі толькі што прасьпяваных песьняў, на гэты раз ужо з плёнкаў наіграных нейкім аматарам.



СТУДЭНЦКІ ХОР ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПРАФ. М. РАВЕНСКАГА

Другая частка выступу пачынаецца із «Суіты» сп. камп. М. Равенскага, выкананай на піяніне сп. др. І. Лыславам і «Варыяцыяй на народныя тэмы» у вадлымі паясьненьнямі да песьняў шмат прычыніўся да зразуменьня слухачамі нашых вызвольных імкненьняў.

А. А.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы вышэйшыя карэспандэнцыі, з асаблівым націскам хочам падчыркнуць, што беларуская студэнцкая група ў Лювэне выказала дагэтуль многа ахвярнасьці, добрае волі й юнацкага энтузыязму ў няўтомнай дзейнасьці ў галіне прапаганды беларускага імені сярод бэльгійскага грамадзянства. Гэта ўсё заслугоўвае на асаблівую ўвагу й поўнасьцю заслужаную пахвалу яшчэ ў сувязі з тым, што нашыя студэнты, будучы змушанымі вучыцца й здаваць эгзамены, а некаторыя зь іх і вывучаць французскую мову, умеюць знайсьці вольны час для так плоднай працы на карысьць нашай нацыянальнай справы. Гэтая іхная дзейнасьць бясспрэчна не астанецца бясьследнай у вагульным балянсе дзейнасьці нашае эміграцыі на чужыне, доказам чаго ёсьць факт, што дзякуючы ей беларуская нацыянальная праблема для шырэйшых колаў бэльгійскага грамадзянства ня ёсьць ужо чужой і няведамай.

Таму астаецца толькі пажадаць, каб і іншыя беларускія эміграцыйныя асяродзьдзі бралі прыклад з нашых лювэнскіх студэнтаў.

Такога вышукаюць струпа
Ці адшчапенца-курашчупа,
Што й службе тэй ня будзеш рады
І адчураешся пасады.
— Вядома так, — і Ганна кажа: —
Жыцьцё і сьвет табе завяжа,
Як гад які сюды прыпрэцца;
І няма ведама, дзе дзецца,
Як дапячэ табе часамі,
Хоць ты наймайся батракамі.
— Эх, брат! — махнуў Міхал рукою: —
Мы чулі ўладу над сабою,
А пажывём — яшчэ пачуем,
А тут, хоць як мы ні мяркуем,
Але нічога не даб'ёмся,
Куды ні пойдзем, ні таўкнёмся,
Дабра ніколі ня прыдбаем,
Пакуль свайго кутка ня маем.
— Свайго кутка! сказаць то лёгка.
Ды гэта справа вельмі крохка:
Тут грошай трэба поўна жменя —
Ня наша голая кішэня...
Купі зямлю ды замацуйся,
Купі ты лесу, пабудуйся...
А ў Мікалаўшчыну вярнуцца —
Ўжо лепей тут як-небудзь гнуцца,
Бо там — галда, там шум, цяснота,
І не бярэ ніяк ахвота
Туды зноў ехаць будавацца,
Дык трэба службы ўжо трымацца
Пакуль яшчэ трымацца можна, —
Антось зазначыў асьцярожна,
Да дзядзькі маці далучылась,
Ў другі бок мова пахілілась;
І будзе новая тут хата,
Пасада пашаю багата,
Ніхто цябе тут ня сьціскае
І ў твой гаршчок не заглядае,
Сядзець ня будзеш тут бяз хлеба.
А пацярпець, вядома, трэба.
— Так, пацярпець! адно цярпеньне
І можа даць табе збавеньне, —
Тут усьміхнуўся Міхал скрыва: —
І гніся век, цярпі маўкліва,
Пакінь ты ўсякую надзею
Хамут зь сябе зьняць, дабрадзею!
А над уласнай гаспадаркай
Варонай чорнаю закаркай
І цяжкі крыж пастаў над ёю,
Як мусім ставіць над сабою.
Цярпеньне — ўсё: яно — бязмежнасьць!
Навошта-ж тая незалежнасьць?
Навошта гэтае імкненьне
Пусьціць у грунт у свой карэньне?
Але-б вы самі спрабавалі,
Калі-б у вочы вам плявалі
І вас агіднаю зьнявагай
Па сэрцы білі-б, як тэй шлягай!
А ты маўчы, сьвяці вачамі
Перад паўпанкамі, панкамі
І перад панскім розным збродам,
Цярпеньнем скованы, як лёдам! —
Ў Міхала губы дрыганулі
І вочы іскры сыпанулі.
— Ці мала ўжо цябе тут гнулі?
Цярпі, маўчы, знасі пакорна,
А кожная сьвіньня надворна,
Сьвістун ці выродак паганы,
Няшчасны лёкай падзіманы,
Ці так нікчэмная басота,
Яна твайго ня варта бота, —
Цябе скубе, цябе ўшчувае —
Маўчы! няхай-жа бэсьціць, лае,
За нос, як хоча, няхай водзіць! —
Антось і Ганна не знаходзяць,
Што адказаць і што парадзіць
І як пытаньне гэта ўладзіць.
Прайшла нядзеля і другая —
Час не стаіць і не чакае.
Ўжо хата новая гатова,
Прыбраны трэскі ўжо і дровы;
Над белым дахам, як карона,
Красуе комінак чырвоны;
Прыветна вокны пазіраюць,
Бы вас у госьці запрашаюць, —
Ну, добры выгляд хата мае,
Яна і цешыць, здавальняе.
Сюды сямейка перабралась,
І хата гэта паказалась,
Пасьля зямлянкі проста раем.
— Хоць хату добрую, а маем, —
Ня тое цеснае скляпеньне! —
Казала маці ў здавальненьні: —
Чысьцютка, сьветла, бы ў пакоі! —
Прыемна пахла тут смалою
І сьвежым дрэвам, хваіною.
І ўсё здавалася-бы гладка,
Каб так ня скончылась загадка
Аб тым падлоўчым на кватэры.
Аб'езчык, самы той Ксавэры,
Прынёс навіну ў гэту хату.
— Не падвязло нашаму брату:
Пякельны пан! — Ксавэры кажа: —
Як ноч, на нас на ўсіх ён ляжа.
— А хто такі? — Міхал пытае.
— Бадай яго Міхал ці знае:
То пан Ракоўскі з-пад Татаркі!
Як кажуць, пан занадта шпаркі...
— Пастой, пан, прозьвішча знаёма!
Ну, так: я чуў аб ім, вядома...
Дык пан Ракоўскі! Ну, віншую!
Пакажа нам, дзе рак зімуе! —
І — ха-ха-ха! — Міхась рагоча:
Ён паказаць тым сьмехам хоча,
Што ашукалісь нечакана,
Прыдбаўшы гэтакага пана.
— А як-жа! чуў я, што за пташка!
Лядачы нораў, лае цяжка,
Яшчэ і звычай такі мае,
Што з кулакамі налятае.
Лясьнічы новы не зьявіўся,
А ўжо, як трэба, уявіўся;
Усё падробна расьпісалі,
Як-бы яго даўно тут зналі:
І як ён выглядзіць сабою,
І што ён мае за душою,
І чым выдатны і багаты,
Ці кавалер ён, ці жанаты,
Калі, дзе чым ён вызначаўся,
Як да людзей слатой чапляўся, —
Ну, адным словам, адчыталі,
Ўсе косьці пану перабралі.
І праўда, пан быў злы, паганы
І зьвераваты, падзіманы,
І мух ня мала меў у носе.
І шмат цяжэй тут павялося.
І вось вярнуўшыся з абходу,
Як-бы апушчаны у воду,
Міхал павёў апавяданьне,
Як вышла першае спатканьне.
— Іду, а ён дарогай валіць,
За ім вярхом Абрыцкі смаліць.
Пад'ехаў гэта і спыніўся.
— Дзень добры, пану! — пакланіўся,
А ён, як слуп, і не зважае,
Глядзіць, бы воўк той, і пытае:
— А ты дзе служыш, чалавеча?
— Служу, паночку, я ў Парэччы.
— Ага!.. чаму гэта, ягомасьць,
Вядзеш вялікую знаёмасьць?
Чужых цялят бярэш на пашу?
Наскрозь я бачу службу вашу!
Чаму аб'ездак, сьцежак многа?..
Пільнуйся ты свайго парога,
Бо мне такіх служак ня трэба:
Для гультаёў ня маю хлеба.
Дык памятай, чаго наймаўся! —
Сказаў і далей паімчаўся.
— Ну, ўжо ўвялі цялят у вушы!
Ох, ды і людзі-ж! што за душы! —
Гаворыць маці абуркліва.
— Чаму ня скажуць? ото дзіва!
Той самы «Тэш», каб падлізацца,
Гатоў хоць чорту запісацца,
Яшчэ прыбавіць і размажа! —
У гневе дзядзька Антось кажа.
Апавяданае здарэньне
На іх наводзіць засмучэньне.
— Ну, што-ж? цярпі, маўчы зацята,
Бо так выходзіць, небажаты: —
Наняўся, кажуць, як прадаўся! —
Міхал злосьмешна адазваўся.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Аб „Пагоні за далярам“

(Адказ сп. Ст. Крушынічу)

АД РЭДАКЦЫІ: Гэты артыкул ёсьць адказам на зьмешчаны ў Но. 75 «Бацькаўшчыны» артыкул Ст. Крушыніча «Пагоня за далярам або яшчэ аб тараканох у саладусе». Хаця Рэдакцыя не ўва ўсім згаджаецца з паважаным аўтарам, аднак у імя аб'ектыўнасьці памяшчае яго з прыемнасьцю на балонах «Бацькаўшчыны». Дзеля выясьненьня хочам толькі адцеміць, што ані Ст. Крушыніч, які зьяўляецца сталым працаўніком Рэдакцыі, ані Рэдакцыя сама, ставячы абвінавачаньне беларускай эміграцыі ў ЗША ў ейным зматарыялізаваньні й што раз большым матарыялізаваньні, ня мелі на думцы ўсіх бяз выключэньня эмігрантаў. Нам ведама, што й там ёсьць ня мала ідэйных і актыўных працаўніkоў, якія з адданасьцю выконваюць важную нацыянальную працу. Бяда толькі ў тым, што вялікая часьць можна й большыня за адзіны свой ідэал уважае даляр і собскае дабро, забываючыся што раз болей аб тэй іхнай нацыянальнай місыі, дзеля якой яны й апынуліся на чужыне.

Крытыка вельмі карысная справа, але толькі тады, калі яна здаровая, рэчавая, справядлівая, будуючая, а не такая, што безаглядна б'е доўбняй па «ўсіх і ўся», як кажуць, «гамузам», абы было мацней, абы большы «боўць»!

Выступленьне сп. Ст. Крушыніча у № 75 «Бацькаўшчыны» ад 11. 11. 1951 г. із славутымі «Тараканамі ў саладусе» можа быць прыкладам падобнага, нажаль, непрадуманага «боўця».

Сп. Крушыніч вельмі пахопна робіць страшэнна сумны выснаў адносна вартасьці беларускае эміграцыі ў Амэрыцы, бо паводля яго: «... **адзіным ідэалам** новага беларускага эмігранта ў Амэрыцы — **быў даляр**, вялікае й выгоднае памешканьне, электрычная лядоўка, аўта, ну й собскі дом» і што быццам-бы ўсё гэта адбываецца «... коштам духовага абядненьня нашых там суродзічаў», а ўжо квінтэсэнцыю ўсяго пракурорскага акту абвінавачаньня маюць хіба наступныя радкі: **«Высокія нацыянальна-вызвольныя ідэі** беларускага народу, якімі яшчэ нядаўна ў Нямеччыне жыла нашая інтэлігенцыя, пачуцьцё абавязку ахвярнай працы й змаганьня над іхным ажыцьцяўленьнем **уступілі месца нізкім матарыялістычным інстынктам».**

Прачытаўшы гэткі прысуд, той, хто не арыентуецца ў запраўдным становішчы ў ЗША, напэўна скажа: «Вось вам вашыя змагары, вашая інтэлігенцыя! А я-ж казаў, што гэтак будзе!». А той, каму гэта патрэбна, падхопіць ды й пачне разьдзьмухваць кадзіла, не прамінуўшы яшчэ нагоды, каб дадаць і тоесёе ад сябе, бо чаму-ж не, «самі-ж пішуць, а шыла ў мяшку ня ўтоіш!»

Ніхто ніколі ня будзе пярэчыць, што **былі, ёсьць і,** нажаль, **будуць** людзі, дзеля якіх найважнейшым ідэалам у сьвеце ёсьць собская пэрсона і ейнае дабро, а рэшта — паза ім і пасьля яго — хай хоць сусьветны патоп! Былі яны й дома на Бацькаўшчыне, і ў Нямеччыне, ёсьць і ў ЗША, Ангельшчыне, Аўстраліі — усюдых. Гэта няўнікнёнае зло, і хай сабе яны жывуць далей «па свойму» на сьвеце, — трэба толькі імкнуцца да таго, каб племя гэтае не пашыралася, не абрастала іншымі спадарожнікамі, слабейшымі мо' за нас духова. Гэтых апошніх трэба й варта перасьцерагаць ды падтрымоўваць на духу, але не аглушаць доўбняй.

Пара ўрэшце ўсім тым, что бярэцца крытыкаваць тыя ці іншыя недахопы нашага жыцьця, усьведаміць сабе раз і назаўсёды, што, калі ёсьць якаясь нэгатыўная праява, то яна ніколі не абымае **ўсіх пагалоўна,** дзеля гэтага **ўсеагульняючыя,** можа навет і бліскучыя, павярхоўна імпануючыя, але неабгрунтаваныя выснавы, больш шкодзяць чымсь дапамагаюць справе.

Трэба ўрэшце зразумець і тое, што гэтакая ператасоўка нашай эміграцыі зь Нямеччыны, ейнае масавае перасоўваньне за акіян, як гэта было апошнія паўтары гады, не магла не адбіцца да пэўнай ступені на нейкі час ад'емна на размаху грамадзкае справы, але, ізноў-жа, толькі да пэўнага часу і не таму, што «даляр зацьміў усё».

Даляр гэты тут ня бегае па вуліцы, каб толькі адно «ганяцца за ім», спрытна лавіць ды пхаць у кішэні. Кажны наш новы эмігрант, як толькі зробіць першы крок з параходу на бераг, ужо больш ня мае апекі «Цёці ІРО», — благая яна была ці добрая, але ўсё-ж была. Тут ужо былы ДП — чалавек самастойны, вольны, вольны аж занадта, бо вельмі часта ад усяго: ад хлеба, грошай, працы, даху над галавой і зразуменьня, бо ня ведае мясцовай мовы.

Аднак аніводзін яшчэ не загінуў, ня збэсьціўся, а навет, як чуваць, сёй-той і сваю хату мае. І гэта не таму толькі, што трапіў у краіну багатых магчымасьцяў, а ў першую чаргу таму, што кажнага такога на пачатку прыгарнуў хтось із гэных «матарыялістых», раней сюды трапіўшых, дапамог яму й радай і капейкай сьмялей ставіць першыя крокі на чужой зямлі. Ці-ж гэта ня будзе нацыянальнай справай, Спадару Крушыніч? А гэтым якраз найбольш даводзілася займацца на пачатку. Дзеля прыкладу можна прыгадаць хоць-бы аднаго сп-ра Пётру М-ча, які не пасьпеў яшчэ распакаваць як сьлед сваіх валізак у «большай, выгаднейшай кватэры», пасьля колькімесячнага валяньня на падлозе на 100-ай вуліцы (добра што й гэта было, бо людзі прыбывалі, а разьмяшчаць не заўсёды было дзе), як гэтая ягоная кватэра зрабілася на колькі месяцаў «транзытным лягерам», як тут у нас жартавалі; прайшоў праз гэты «лягер» не адзін былы ДП і ня быў пакрыўджаны.

Трэба было таксама думаць і аб сабе ды сваёй сям'і, «гнацца» за далярам, бо безь яго ніхто й «маггі» поліўкі ня дасьць, як калісь давала нябожчыца ІРО. А даляр, ліханька яму, з характарам. Залезе часамі ў такое пекла, як смалярня (даслоўна) або фарбярня, дзе дыхаць нельга, а ты яго мусіш валачы адтуль, аж вочы на лоб лезуць, але валачэш, бо ты «матар'ялісты!» (Гэткім «матар'ялістым» 5 месяцаў быў аўтар гэтых радкоў.) Бывае яшчэ й так, што даляр гэты дзесь так схаваецца, што хоць трэсьні, нідзе яго ня знойдзеш, швэндаецца тады бедны б. ДП, ды патыліцу скрабе, аж пакуль пры дапамозе ўсялякіх агенцыяў, старых і новых добрых знаёмых ня знойдзе лепшага месцазнаходжаньня даляра, толькі тады ўжо пачынае думаць і аб лядоўцы, якая, дарэчы кажучы, тут ня ёсьць раскошай, а простай неабходнасьцю ў мясцовых варунках.

Нічога дзіўнага й грэшнага я ня бачу ў тым, што зь цягам часу нашыя працавітыя людзі пачынаюць урэшце жыць хоць крышку па-людзку, асабліва тыя, што маюць большыя сем'і з дарослымі і маюць якісь фах.

Наадварот, трэба цешыцца, што людзі нашыя руплівыя, хутка перамагаюць усялякія турботы ды мацней становяцца на собскія ногі. Калі-б мы мелі яшчэ тут сваіх прамыслоўцаў-суродзічаў ды бізнэсмэнаў, як гэта маюць іншыя нацыянальнасьці, то куды спарней магла-б разьвівацца ўся нашая праца.

Інтэлігенцыя тут знаходзіцца ў крыху адменным становішчы, бо ўсе бяз выключэньня вымушаныя працаваць пакуль што дзе ўдасца, ня ў сваім фаху й пераважна фізычна, мае меншыя заробкі й вельмі мала часу на іншую, духовую дзейнасьць.

Аднак, памінаючы ўсе гэтыя цяжкасьці, пераважная большыня мясцовай новай эміграцыі робіць усё магчымае, каб голас беларуса быў чутны ўсюды, каб не разгубіцца й быць падрыхтаванымі на ўсё. Довадам гэтага зьяўляюцца: удзел беларусаў ува ўсіх міжнацыянальных акцыях ня толькі ў Нью-Ёрку, але і ў Кліўлендзе, Дэтройце, Чыкаго, усюды, дзе толькі ёсьць нашыя людзі, дзейнасьць Беларускае Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы, дзейнасьць такіх арганізацыяў, як вэтэранаў, (прыпомнім хоць-бы сьвяткаваньне Дня Герояў у Нью-Ёрку), студэнтаў, скаўтаў, моладзі (асабліва ў Кліўлендзе), пісьменьнікаў і журналістых, якія штомесячна ладзяць свае публічныя літаратурныя вечары, навуковых працаўнікоў і грамадзкіх дзеячаў, што пасьля цяжкай фізычнай працы знаходзяць час на падрыхтоўку розных лекцыяў-рэфэратаў, якія сыстэматычна адбываюцца, запачаткаваньне працы Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтваў, ды ўрэшце Б. А. З. А.

Дык на чым-жа абапіраецца Вашае цьверджаньне, сп-ру Крушыніч, што «пачуцьцё абавязку ўступіла месца нізкім матарыялістычным інстынктам?» Праўда, мы яшчэ не патрапілі пераканаць канчаткова Амэрыку, што з бальшавізмам годзі ўжо даўно цацкацца, што пара ўжо дапамагчы народам з паза ведамай заслоны скінуць ярмо, а ў тым ліку й нашай Бацькаўшчыне, але гэта не адны мы. Запраўднай віной нашай можа быць толькі тое, што мы шмат робім, але тое, што робім, ня ўмеем належна паказаць, як сваім, гэтак і суседзям; што мы яшчэ не здабыліся на ўпарадкаваньне й рэгулярнасьць сваей прэсы, — вось дзеля гэтага, мне здаецца, і могуць узьнікаць падобныя памылковыя выснавы, як гэта здарылася ў сп. Крушыніча.

Г. Няміга

Нью-Ёрк, люты 1952 г.

Нацыянальны склад насельніцтва Савецкага Саюзу

Вялікі прыяцель паняволеных бальшавізмам народаў у ЗША сэнатар О'Конор зрабіў 13 кастрычніка 1951 на зьезьдзе Задзіночанага Украінска-Амэрыканскага Дапамаговага Камітэту ў Філядэльфіі даклад п. н. «Трагэдыя ўкраінскага народу», у якім, між іншым, апіраючыся на афіцыяльныя статыстычныя дадзеныя з 1939 г. падаў нацыянальны склад насельніцтва Савецкага Саюзу ў разрэзе паасобных саюзных рэспублікаў. Паколькі гэтае пытаньне зьяўляецца наагул цікавым і паколькі ня маем пад рукою іншых мерадайных крыніцаў, падаём тут нацыянальны склад насельніцтва Савецкага Саюзу за сэнатарам О'Конорам. І так:

1. Расейская Савецкая Фэдэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка (РСФСР) мае 114.337.428 чалавек, з чаго — 83.923.672 расейцаў, а 30.413.756 нерасейцаў, што становіць 26.6% нерасейцаў.

2. Украінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае ўсяго насельніцтва 42.272.943, з чаго расейцаў — 3.889.111, а нерасейцаў — 38.383.832 або 90.8%.

3. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае ўсяго 10.525.511, з чаго расейцаў — 757.837, а нерасейцаў — 9.767.674 або 92.8%.

4. Эстонская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае насельніцтва 1.120.000, з чаго расейцаў — 91.840, а нерасейцаў — 1.028.160 або 91.8%.

5. Латыская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае ўсяго насельніцтва 1.950.502, з чаго 239.912 расейцаў, а 1.710.590 нерасейцаў або 87.7%.

6. Летувіская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае 3.134.070, з чаго расейцаў — 78.352, а нерасейцаў — 3.055.718 або 97.5%.

7. Малдаўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае ўсяго 2.321.225. Няма аднак дадзеных, колькі расейцаў, а нерасейцаў аўтар прыблізна аблічае на 100%.

8. Грузінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае насельніцтва 3.722.252. Колькасьць расейцаў непададзена, таму нерасейцаў аўтар прыблізна аблічае на 100%.

9. Армянская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае насельніцтва 1.346.709. Таксама колькасьць расейцаў непададзеная, а нерасейцаў аўтар аблічае на 100%.

10. Азэрбайджанская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае 3.372.794 насельніцтва, з чаго расейцаў — 327.161, а нерасейцаў — 3.045.633, што становіць 90.3%.

11. Казахская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае насельніцтва 6.458.175, з чаго расейцаў — 1.272.260, а нерасейцаў — 5.185.915 або 80.3%.

12. Узбэцкая Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае насельніцтва 6.601.619, з чаго расейцаў — 369.691, а нерасейцаў — 6.231.928 або 94.4%.

13. Туркмэнская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае насельніцтва 1.317.693, з чаго расейцаў — 98.827, а нерасейцаў — 1.218.866 або 92.5%.

14. Таджыцкая Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае ўсяго насельніцтва 1.560.540. Колькасьць расейцаў не пададзеная, таму нерасейцаў аблічае аўтар на 100%.

15. Кіргіская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае ўсяго насельніцтва 1.533.439. з чаго расейцаў — 179.412, а нерасейцаў — 1.354.027, што становіць 88.3%.

16. Карэла-Фінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае насельніцтва 512.977, з чаго расейцаў — 292,397, а нерасейцаў — 220.580 або 43%.

Усяго-ж насельніцтва ў цэлым Савецкім Саюзе было ў 1939 г. — 202.087.877, з чаго расейцаў — 91.520.472, а нерасейцаў — 110.567.405, што становіць 54.7%.

З вышэй пададзеных лічбаў бачым, што навет згодна афіцыяльнай савецкай статыстыкі з 1939 г. нерасейцаў у Савецкім Саюзе было болей, чымсьці расейцаў, бо 54.7%. Аднак гэтая статыстыка яшчэ далёка не адказвае праўдзе, бо ў запраўднасьці ў Савецкім Саюзе нерасейцаў ёсьць значна болей.

Справа ў тым, што ня ўсе этнаграфічныя тэрыторыі многіх народаў уключаныя ў саюзныя рэспублікі нерасейскія, бо частка гэтых тэрыторыяў прылучаная непасрэдна да РСФСР. Гэтак, прыкладам, уся ўсходняя й паўночная Беларусь з Бранскам, Смаленскам, Вялікімі Лукамі, Вяліжам, Невелем і іншымі гарадамі належыць да РСФСР, дзе савецкая статыстыка разглядае насельніцтва, як расейскае.

Апрача гэтага некаторых народаў Саветы не вызнаюць за апрычоныя народы, адносячы іх мэханічна да расейцаў. Прыкладам гэтага зьяўляецца адзінацыямільённы казацкі народ.

Дык калі-б унесьці гэтыя папраўкі, тады смела можна ўважаць, што нерасейскія народы складаюць у Савецкім Саюзе 65% усяго насельніцтва, а расейцы — толькі 35%.

X

НА ПАНСКАЙ СЛУЖБЕ

У той-жа дзень, праз час каторы,
Прыйшоў сюды Марцін з Каморы,
Лясьнік таксама пры кватэры.
Загады розныя, паперы
Яму ў лясьніцтве даручалі,
Калі з наказам пасылалі.
Яшчэ здалёк, аж каля кліна
Антось заўважыў тут Марціна.
— Ну, прэцца ўжо Марцін з наказам!
Згарэў-бы ты, панок, зь ім разам! —
Дабра так пану пажадалі,
Але зь цікавасьцю чакалі,
Што ім Марцін тут засьпявае.
— Ну, што нам, васпан, сказаць мае?
— Наказ прынёс я да васпана!
Наказ такі, каб заўтра зрана
Твой брат Антось шоў да адбору,
А сам Міхал аб гэту пору
Настройваў лыжы да сялібы —
Падбаць паном наконта рыбы;
Бяры там невад з рыбакамі,
Паноў парадуй шчупакамі:
Галодны, можа, небаракі,
А мо' абрыдлі ім прысмакі —
Вяндліны, мяса і катлеты,
Павысыхалі, як шкілеты,
Іх вецер з ног ледзь ня ськідае! —
Марцін тут жарту падпускае.
— Ну вось, ужо і даў задачу!
— Ты нездаволены, як бачу;
Але пастой, Міхал, даслухай,
Тады ты ўжо глуздом парухай:
Пан прыказаў яшчэ васпану,
Злавіўшы рыбы, каб тады-жа
Сам васпан вёз і да Нясьвіжа
Таму-другому калашману,
Што падпіраюць князеў замак,
Для цешчаў іх і розных мамак.
— Наказ нічога для пачатку!
Што-ж далей будзе, пане братку? —
Э-ге-ге-ге! ня мець спакою! —
Міхал затрос тут галавою: —
Ой, дасца гэта служба ў знакі!
На карк усьсядзе д'ябал ўсякі.
Хіба ён літасьць, сэрца мае?
Ўжо двух у службу запрагае:
Адзін на рыбу — той ў адборку ...
Няма на іх, гадаў, паморку,
Вось на такіх чартоў лазатых,
На гэтых джынджыкаў праклятых!
Быў чалавек, што можна-б ладзіць,
Дык вось няма — памёр! Ня вадзіць
На добрых нам паноў ніколі.
А вось такі «Рак», ліха долі,
Ня будзе мець табе і зносу.
Так, брат: для нашага ён лёсу!
І ёсьць-жа прыказка такая:
«Кляні ты пана — пан сычае!»
Міхал хадзіў і бунтаваўся,
І на лясьнічага злаваўся.
— Ідзе работа, сеяць трэба,
Ляжыць ня ўзвараная глеба,
А ты й каня бяры ў прыдачу ...
Сказаць-то лёгка — даў задачу! ...
Ото бяда! ото галеча!
А меў-бы кут свой, чалавеча,
Ці-ж бы служыў? цярпеў-бы зраду?
Даўно-б у морду плюнуў гаду!
Пайшоў ты к ліху, праваліся!
Сам гэтым хлебам падавіся!
Вось тут-та, брат, і гора тое
І гэта ліха насланое,
Што нам няма дзе зачапіцца,
І мусім з гэтым мы гадзіцца,
Пад дудку панскую скакаць
І іх загады выпаўняюць. —
Цябе-ж дзяруць, як тую ліпку! —
Марцін зь кішэні вынуў піпку,
Цыбук заядла прадзімае
І піпку пальцам набівае.
— Цьфу! лае, бэсьціць з-за нічога!
А мух, брат, мух у носе многа!
І так нясецца ён, васпане, —
Тычына шапкі не дастане!
Не пазірае табе ў вочы,
Глядзіць, бы воўк той, заўжды скрыва
І заўжды злосны ён на дзіва,
І заўжды лаяцца ахвочы ...
Ды чорт яго бяры, Міхале!
Што зробіш гэтакай завале?
Вось будзем жыць сяк-так памалу,
Ці гэта ў першы раз Міхалу
Такія справы мець з панамі?
Няхай яны лепш здохнуць самі,
Чым мець празь іх яшчэ згрызоты.
Хіба-ж, Міхале, мы сіроты?
І пан, калі нам пашанцуе,
Пад нашу дудку затанцуе:
Няпраўда — згіне племя злое!
— Калі-ж-та будзе сьвята тое?
Хіба, як возьме нас магіла?
Ня наша, браце, а іх сіла! ...
Адно, брат, тут: старацца трэба
Прыдбаць сваю скарынку хлеба,
Бо людзі кажуць: «Хлеб служачы
Ня надта добры хлеб, — сабачы!»
І не сабака страшан воўку,
Калі прышлося сказаць к слоўку,
Мой пане-браце, мой Марцяга,
А няпрыемна яго зьвяга!
Яшчэ крыху паразважалі
І трохі злосьць сваю сагналі.
Марцін пайшоў, але для пана
Было яшчэ крыху дадана
Ня вельмі добрых пажаданьняў
І пацер розных, і літаньняў.
Але дабра, палёгкі, толку
Ня прыбыло з таго й на голку.
Спакою тут Міхал ня знае,
Як-бы на колы вада тая,
Міхал ідзе ды йдзе ў вабходы,
І ня ухілішся ад шкоды:
То дуб сьсякуць, бярозу зваляць,
А там і лес табе падпаляць
Або патравяць сенажаці,
Пажнуць траву на корм цяляці.
Народ жадзён, бо жыве ў сьціску,
Гатоў у вочы сыпнуць прыску,
Зрабіць зумыслу дзеля зьдзеку, —
Не, не ўнаровіш чалавеку!
І свой-жа брат цябе кусае,
Бо кажны выслужыцца хоча:
Адно гаворыць табе ў вочы,
Але другое ў мысьлях мае,
І ўжо здарэньня ня мінае
На чым хоць-небудзь зло спагнаць,
Як мае быць, цябе даняць.
А там надыйдзе тое лета,
Глядзі, каб ягад бязь білета
У лесе бабы ня зьбіралі
І на грыбы каб білет бралі.
Так вось заўсёды сьвет зачынен,
І сам-жа ты яшчэ павінен
Падатак пану свой даваць —
Грыбоў і ягад назьбіраць.
А пан табе не спагадае,
Сваю работу загадае:
То пастуха згадзі, служанку,
Да ночы біся спазаранку.
А там надыйдзе касавіца —
Ўставай, ледзь гляне зараніца,
Ідзі, касцоў наймай і жней!
Рабі ўсё борзда, гладка, чыста.
Але пагода наравіста,
І ў часе самае работы
У небе ўсходзяцца грымоты,
І невады за невадамі
Працягнуць хмары над грудамі,
Спусьціўшы пасмачкі-палосы,
Зальлюць і копы і пракосы.
І за той жарт Ільлі прарока
Ня будзе мець на цябе вока.
Служы, працуй на пана-ката,
А сам ня ўправішся, дык брата
Бяры ты з дому на падмогу.
Няхай з табою нага ў ногу
Ідзе па службе, памагае,
А не, то й сына прыпрагае.
Ці-ж гэта лад? ці-ж то парадак?

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

У справе анулявaньня Ялты

Польская Лёнданская газэта «Ожэл Бялы» зьмясьціла ў нумары за 26 студзеня сёлета інтэрвью з амэрыканскім кангрэсмэнам польскага паходжаньня Т. Махровічам. На запытаньне супрацоўніка польскае газэты, ці Т. Махровіч зьяўляецца ініцыятарам унесенага ў кангрэс праекту анулявaньня пастановаў канфэрэнцыяў у Ялце й Тэгеране, амэрыканскі кангрэсмэн паведаміў наступнае:

«Так. У травені мінулага году я высунуў на пленуме кангрэсу праект адкліканьня пастановаў, заключаных у Ялце й Тэгеране, і вызнаньня іх за няважныя. Гэты свой праект я абгрунтаваў недатрыманьнем забавязаньняў Савецкага Саюзу правесьці вольныя парлямэнтарныя выбары ў Польшчы ў 1946 годзе.

Як ведама, выбары ня былі свабодныя. Польскі народ ня меў магчымасьці выбраць парлямэнтарнай рэпрэзэнтацыі паводля сваей волі й даверу. Былі яму накінутыя камуністычныя ўрадавыя формы, а край быў аддадзены пад акупацыю Савецкага Саюзу.

Што было гэтак, а ня йначай, сьветчыць многатысячная армія польскіх эмігрантаў і палітычных уцекачоў, а таксама цяперашняя вайсковая камуністычная дыктатура, якую праводзіць пасланы ў Польшчу савецкі маршал Ракасоўскі.

Праект у справе адкліканьня ялтанска-тэгеранскіх пастановаў быў перададзены ў Камісыю Замежных Справаў Кангрэсу. Паводля запэўненьня, атрыманага ад старшыні гэтай Камісыі кангрэсмэна Мэк Кэя, праект гэты будзе пастаўлены на парадку дня кангрэсу яшчэ ў гэтым годзе.

Адкліканьне няслаўных пастановаў часткава зрэгабілітуе Задзіночаныя Штаты ў вачох апініі народаў цэлага сьвету, узмоцніць у іх веру ў дзяржаву магутнасьці й справядлівасьці, а сярод народаў за зялезнай заслонай і ў Польшчы перадусім паглыбіць надзеі хутчэйшага атрыманьня дзяржаўнай незалежнасьці».

Тое, што справа адкліканьня пастановаў Ялты й Тэгерану знойдзецца на парадку дня амэрыканскага кангрэсу, абнадзейвае палякаў на паўторны захоп у будучыні Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны, а на сяньня — на нявызнаньне Амэрыкай цяперашніх усходніх граніцаў Польшчы. Гэтым, між іншым, тлумачыцца й ажыўленая прапагандовая акцыя за зварот Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны ды бесканечнае фабрыкаваньне што раз новых «аргумэнтаў» за гэты зварот, чым перапоўненая сяньня польская эміграцыйная прэса.

Сяньня яшчэ цяжка варажыць, ці пастановы Ялты й Тэгерану будуць Амэрыкай ануляваныя, ці не. Аднак іхнае эвэнтуальнае ануляваньне яшчэ ня можа азначаць згоды Амэрыкі на перадачу заходня-беларускіх і заходня-украінскіх тэрыторыяў Польшчы, паколькі іх засяляе кампактнай масай беларускае й украінскае насельніцтва.

Лёс Заходняй Беларусі й Заходняй Украіны будзе бясспрэчна залежыць ад будучага лёсу ўсяго беларускага й украінскага народу. Змогуць гэтыя народы адбудаваць свае незалежныя дзяржавы, — у чым мы ніколі ня сумляваемся, — арганічнаю часткаю гэтых дзяржаваў мусяць стацца іхныя заходнія землі. А польскім захопнікам мы хацелі-б прыпомніць ня вельмі прыемную для іх лекцыю зь іхнай собскай гісторыі. Польскія захопніцкія апэтыты на чужыя тэрыторыі й няпольскія народы былі галоўнай прычынай разьдзелаў Польшчы, якіх адбылося ўжо чатыры, а сяньня навісае пагроза разьдзелу пятага. У выпадку-ж паўторнага захопу заходня-беларускіх і заходня-украінскіх земляў коштам вольнасьці й незалежнасьці мільёнаў беларусаў і ўкраінцаў бясспрэчна ня міне яе й разьдзел шосты, які ў параўнаньні з усімі папэрэднімі можа стацца найбольш крывавым і для палякаў найбольш няслаўным.

Р. С.

Прыемнае з карысным

Беларускае Студэнцкае Згуртаваньне ў ЗША і Жаноцкая Сэкцыя пры БАЗА 2-га лютага г. г. сумесна наладзілі вельмі ўдалы канцэрт-баль у памешканьні клюбу старой беларускай эміграцыі ў Нью-Ёрку.

Мэтай гэтае імпрэзы было задэманстраваньне перад шырэйшым колам грамадзянства, як старых гэтак і новых эмігрантаў, у самадзейным выяўленьні мастацкіх здольнасьцяў нашае моладзі, папулярызацыя беларускіх народных песьняў, музыкі і скокаў ды ўрэшце папаўненьне касы абедзьвюх арганізацыяў, якія маюць вельмі шмат выдаткаў, асабліва Жаноцкая Сэкцыя, што займаецца выключна сацыяльнай апекай і дапамогай патрабуючым суродзічам ня толькі ў ЗША, але й паза межамі.

Рызыка была даволі значная пры плянаваньні імпрэзы, бо зьвязаная ад самага пачатку з выдаткамі: вынаймо залі, аркестры, абвесткі ў газэтах і пад. бяз аніякай гарантыі пакрыцьця іх. І хоць давялося шмат набегацца й папрацаваць, асабліва сп. Вержбаловіч і сп. Б. Данілюку, аднак спадзяваньні ініцыятараў апраўдаліся, бо нашыя былыя ДП-беларусы, а цяпер ужо «Амэрыканскія тараканы ў саладусе», як іх часамі маюць гонар тытулаваць у Эўропе некаторыя нашыя суродзічы, зьявіліся ня толькі з усіх раёнаў Вялікага Нью-Ёрку, але й з адлеглых ваколіцаў, як Саўт-Рывэр, Нью-Джэрсі, Патэрсон, каб падтрымаць прыгожае пачынаньне ды пабачыцца й прыемна правесьці час із знаёмымі ў свойскай-роднай атмасфэры. Шмат было гасьцей і зь іншых нацыянальнасьцяў, як украінцы, а таксама й старой эміграцыі. Адным словам заля, як кажуць, «была выпаўнена па берагі» і вельмі цёпла ўспрыймала ўдалую канцэртную праграму ды й здольных выканальнікаў.

На запросіны студэнтаў, весьці праграму пагадзіўся прыяцель моладзі сп. Г. П-іч, які кажны нумар, кажнае выспупленьне падаваў прысутным у цёплым сьвяроўска-жартоўным тоне.

А падаваць было што, бо: дзявочы ансамбль у складзе прыгожых выканальніцаў Г. Дарашэвіч, Натальлі Кушэль, М. Емельяновіч, К. Мельяновіч, Алі й Галіны Орсаў пад акампаніямэнт Г. Ганчарэнкі на акардыоне прыемна песьціў «вока й вуха» гасьцей праз «Кінь вечны плач» М. Багдановіча, муз. М. Куліковіча, ды яшчэ колькіх беларускіх народных песьняў, зь якіх найбольшы пасьпех мела: «Ішоў Тодар із Тадорай», Марш «Мілітэр» Шубэрта, выкананы «у чатыры рукі» на піяніна Аляй Орса й Г. Дарашэвіч сьветчыў аб добрым апанаваньні тэхнікі маладых піяністак.

«Песьня кветак» із опэры «Фаўст» Гуно ў мілым выкананьні Г. Дарашэвіч была прыкладам таго, што моладзь нашая запраўды ўсебакова здольная, бо адначасна зьяўляецца інструмэнтальным, вакальным, драматычным ды хорэаграфічным выканальнікам і то выканальнікам ня «так сабе», а салідным, а гэта-ж была толькі «самадзейнасьць»! А які-б можна было ў будучыні стварыць моцны мастацкі калектыў, каб мець магчымасьць даць гэтым юнаком належную фаховую падрыхтоўку!

Гэта ня ёсьць якоесь «перазахапленьне», але жывая рэчаіснасьць, бо возьмем к прыкладу яшчэ студэнтку Галіну Ганчарэнку, якая даслоўна і «чцец і жнец і на дуду ігрэц», або Тусю Кушэль. Абедзьве яны вельмі ўдала адыгралі гумарыстычную сцэнку із сучаснага жыцьця нашае эміграцыі «Дарагі даляр» (словы Н. Арсеньневай). Т. Кушаль, апрача вакальных магчымасьцяў, мае большы нахіл да драматычнага выкананьня (сцэнка з «Кацярынай і Сьцяпанам» у супольным выкананьні із Б. Данілюком). Г. Ганчарэнка, апрача акампаніямэнту на акардыоне й піяніна, высака артыстычна прачытала «Важную фігу» Ядвігіна Ш., ды выканала на акардыоне «Папуры на беларускія мэлёдыі» М. Куліковіча.

Зусім добра гучэлі бел. народныя песьні «Ой ляцелі гусі» й «Каля рэчкі каля броду» у выкананьні Алі й Галіны Орсаў. Слабей за ўсе нумары выпаў скэч «Збаўленьне», а гэта з прычыны слабой падрыхтоўкі (толькі 2 рэпэтыцыі ды й то ня поўныя).

Прыняў удзел у канцэрце й прысутны на залі, нядаўна прыбылы з Эўропы, актор «Беларускага Тэатру Эстрады» Сп. Нядзьведзкі, які выканаў раманс «Помню вечар адзін я цудоўны» — словы й музыка выканальніка, і танго «Мара» на словы М. Сяднёва; абодвы нумары пад собскі акампаніямэнт на акардыоне.

Закончыўся канцэрт вясёлым беларускім народным танцам «Юрачка», размах якога вельмі-ж тармазіла неадпаведная маленькая сцэна.

Наагул трэба зацеміць, што канцэртная частка, хоць і без дастатковай падрыхтоўкі (адсутнасьць собскага памешканьня дзеля рэпэтыцыяў, занятасьць усіх удзельнікаў працай або навукай, далёкая адлегласьць пражываньня адзін ад другога), прайшоў надспадзявана ўдала, апраўдаў сваю мэту, зрабіў вельмі мілае ўражаньне на прысутных, якія не шкадавалі воплескаў, а пазьней супольна із усімі ўдзельнікамі канцэрту весела скакалі й ,забаўляліся да раньня ды атакавалі буфэт і лётарэю — дзе вяла сваю «праграму» Жаноцкая Арганізацыя пры актыўнай дапамозе спадарынь Мельяновіч, Русак, Юрцэвіч, Рагуля, Акановіч ды іншых.

Як агульны выснаў з гэтага будзе пажаданьне часьцей ладзіць падобныя імпрэзы, якія спалучаюць у сабе прыемнае із карысным.

Студэнт

Новая расейская „калыханка“

(Заканчэньне)

больш расейцаў. І вось гэтая супольная нядоля, на думку Вайнбаўма, павінна ў далейшым замацаваць дружбу паміж расейскім і іншымі народамі. У канцы артыкулу Вайнбаўм піша даслоўна: «Расея будавалася вякамі. Добра ці дрэнна яна будавалася — гэта ўжо належыць да мінулага. Калі ў мінулае адыйдзе бальшавізм, тады толькі паўстане пытаньне аб тым, ці варта разбураць пабудову й разносіць яе па цаглінцы ў розныя староны і ці ня лепш будзе перабудаваць яе, зрабіўшы выгаднай і віднай для карыстаньня ўсіх жыхароў».

Вось дык лоўка! Значыць калі царскія служакі сьцябалі бізуном, а бальшавікі зьнішчалі мільёны «нацмэнаў», а сярод іх пападаліся часам і расейцы, дык гэтыя-ж «нацмэны» павінны трымацца ў будучыні разам зь імі й, барані Божа, не разлучацца, ня гледзячы на тое, што іх чакае ў будучай «дэмакратычнай» Расеі. Аднак калі з адвечнай «турмы» будзе зьняты шыльд «турма», а на ягонае месца павешаны шыльд — «дом адпачынку», а краты ў вокнах будуць называцца «фіранкамі», дык замкнутым у гэтым доме напэўна ад такіх зьменаў не палягчэе.

Ізноў у іншым артыкуле, зьмешчаным у тым-жа «НРС», аўтар П. Уранаў сіліўся даказаць, што ў СССР няма ніякіх нацыянальных розьніцаў, а тэрор і гэнасыдызм стасуецца ў ваднолькавай меры супраць усіх грамадзянаў.

У тым-жа дню ў расейскай радыя-перадачы «Голасу Амэрыкі» было сказана больш менш наступнае: «Найнавейшыя ўцекачы з СССР, якія апынуліся ў Заходняй Нямеччыне, заявілі ўладам, што ў сучасны мамэнт у СССР шалее нябывалае перасьледваньне й нішчэньне паасобных народаў. Асабліва гэта даецца ў знакі народам Каўказу, Сярэдняй Азыі й Прыбалтыкі. Каб такая вестка выйшла ад «расчленителей», то напэўна Уранов назваў-бы яе мітам і ілжой, але калі свае ня могуць схаваць праўды, дык ён павінен маўчаць.

Дык мімаволі насоўваецца пытаньне, чаму Вайнбаўм, Уранаў і ім падобныя гэтак стараюцца схаваць у цёмны куток усю гэтую агідную бальшавіцкую работу і давесьці камусь, што ў СССР усе раўнапраўныя ў сваей нядолі, а тым больш, што гэтае масавае перасьледваньне й забойства вядзецца ня ў імя расейскіх гонаў да панаваньня над слабейшымі? На гэта ёсьць некалькі прычынаў, а вось некаторыя зь іх:

Па першае ім ходзіць аб паваленьне бальшавіцкай сыстэмы толькі таму, каб самым заняць месца ў Крамлі й адыгрываць ролю «собирателей русских земель» ад Атлянтыцкага па Ціхі й ад Паўночнага па Індыйскі акіяны, а мо' й яшчэ далей.

Па другое, уся гэтая маскоўская «калыханка» ня прызначаецца для «расчленителей», якія на сваей скуры адчулі ўсю маскоўскую «справядлівасьць». Ня прызначаецца яна й для сваей, г. зн. расейскай больш менш дэмакратычна думаючай грамадзкасьці, але ёю старающа «закалыхаць» тых заходніх палітыкаў, у якіх адчыняюцца вочы на расейскую запраўднасьць. А тымчасам «айцец народаў» што раз сьмялей праводзіць палітыку расейскай гэгэмоніі на аднэй шостай часьці сьвету, будучы згары пэўным, што ягоную зьвярыную работу падтрымаюць расейцы ня толькі ўнутры СССР, але й расейцы на ўсім сьвеце бяз розьніцы палітычных ахварбовак.

Сяньня камісыяй кангрэсу ЗША вядуцца расьсьледваньні аб забойстве польскіх ахвіцэраў у Катыні. Вось цікава, ці прызнаюць гэнасыдызмам гэтае агіднае забойства спадары Вайнбаўмы? А колькі такіх Катыняў перанесьлі й мы беларусы? Варта толькі прыпомніць Бярэзьвеч каля Глыбокага, спаленьне жыўцом у 1941 г. цэлага транспарту зь «перасяленцамі» каля станцыі Бігосава й г. д. Дык што на гэта можа тады адказаць «Новое Русское Слово»?

В. Нефэдэралісты

ШУКАЮЦЬ

Шукаю: Вайніловіча Янку, нар. 1925 г. ў Асіпавіцкім р-не, Магілеўскай акругі. Апошняя ведамасьць была ў 1944 г. зь Нямеччыны. Калі хто ведае аб яго лёсе, прашу наведаміць на адрас: **J. Pazniak,** 19. Pl. Hoover, Louvain, Belgique.

Згрызот нямала, многа звадак.
І як ні біся, ні старайся,
Хоць на кавалкі разрывайся,
Прычэпку знойдзе і аблае,
Яшчэ й пад носам наківае.
А ты цярпі, маўчы зацята
І слухай споведзь пана-ката.

І крыўда ў тым, мае вы людзі:
І хто-ж то волю даў паскудзе?
Нашто зямля іх, катаў, носіць?
Ой, хто-ж ад іх не загалосіць?
А дзе на іх шукаць управы,
Бо суд «праўдзівы», суд «ласкавы»
Паноў за зьдзекі не карае?
І хто цябе тут падтрымае?
Каму паскардзіцца і дзе?
Хто гэту крыўду адвядзе
І трохі згладзіць перашкоды?
І між сабою няма згоды:
Адны другіх-бы тут паелі,
Або ўтапілі-б, каб прымелі.
Адзін другога не пакрые,
Глядзяць, як ворагі ліхія,
Гатовы ліха прыкупіць,
Каб спатайка цябе ўкусіць.
А пан з таго і карыстае
І па чарзе ўсіх пералае.
— Ну-ж і «Рачок»! ото-ж узьеўся!
Чаго на нас ён так насеўся? —
Казаў, часамі, дзядзька дома:
І як служыць тут — невядома.
Ото-ж зараза ўжо прыўдасца!
Нашто на сьвеце гэта трасца?
Служы яму ты ўсёй сям'ёю,
А сам ты хоць жабруй зімою.
Сказаць, ну, меў-бы ты пасаду,
Дык чорт-бы зь ім, цярпеў-бы гаду,
Але што тут? асот, галота,
Шэсьць дзесяцін — чаго? балота!
Другія маюць па валоках,
Як Ліхтаровіч у Затоках.
І што-ж, адзін ён службу мае,
Ніхто туды не зазірае,
Ніхто там сьвету не завяжа
І, навет, носа не пакажа.
А ты круціся, хвост авечы,
Канца няма той талачэчы,
Ну, проста служба гэта гадзіць,
І кажны нос свой тут усадзіць.
— Вядома, хто дальш ад кватэры,
Таму менш стукаюць у дзьверы,
Да іх дайсьці ня так-то скора,
І там жывуць сабе бяз гора, —
Гаворыць з зайздрасьцю і маці: —
А тут, як дзе на воўчай гаці,
Як на пярэсмаках якіх,
Цябе трывожаць кажны міг.
Але-ж і самі вінаваты,
Калі так коціцеся з хаты,
Дзе толькі пан не загадае.
Ці-ж ён на гэта ласку мае?
Чаму на вас і не налегчы?
Чаму ў хамут вас не запрэгчы,
Калі яго так баіцеся
І так за службу берацеся?
Адзін, вось, служыць — ну, і годзе!
Што патураць яго тэй модзе?
Дзе-ж мала двух, дык трэці Ўладзя!
Чаму-ж на карк табе ня ўсьсядзе?
А трэба, часам, агрызнуцца,
Бо так і будзеш заўжды гнуцца.
— Ого! ты сьмела каля печы,
І праўда: кажаш ты да рэчы.
А ты-б сама, вось, паспытала,
Тады-б ня тое засьпявала, —
Сказаў Міхал крыху сярдзіта: —
І будзе нехаця зашыта
Твая тут губа, мая міла:
Яго тут права, яго сіла!
Або ты знойдзеш праўду ў сьвеце?
Каму пажаліцца, скажэце?
Судзіцца будзеш зь ім? За што-жа?
І хто табе тут дапаможа?
Хіба цябе ён тут трымае?
Служыць гвалтоўна прымушае?
Ня хочаш службы, ну, палайся,
Бяры манаткі, выбірайся,
Але куды? дзе твой прытулак?
Нагатавалі табе булак?
Каму ты міл, скажы, ў бядзе?
Эх, ня прыхілішся нідзе!
Паскачаш дрозьдзіка, бы скочка,
Калі няма свайго куточка.
А як прачуюць гэта людзі,
Ад іх адбою тут ня будзе . . .
Чаму-ж яму не казырыцца?
І вон прагнаць не пабаіцца;
Ты зь ім ня зграешся ніколі,
Раз ты прымушан да няволі.
— Ну, й будзе езьдзіць — што за дзіва!
Калі маўчаць яму цярпліва.
Чаго баяцца? не прагоніць
І горш ужо не запалоніць.
І хто-ж, як ты, на сьвеце служыць?
Аб глупству кажнаму ён тужыць;
Ня сьпіць, ня есьць і ног ня чуе,
У лесе днюе і начуе,
Зь людзьмі грызешся, як сабака, —
А доля ўсё-ж твая аднака.
Чаго-ж так надта выдыгацца?
За што так падаць? так старацца?
Затым, каб больш цябе ганяць?
Часьцей ў ваглоблі запрагаць?
І будуць езьдзіць і ня знайся,
А ты маўчы, а ты старайся ! . . .
Каму, каму, а ўжо Антосю
Сказаць-бы можна, каб прышлося,
Бо ён на службу не наймаўся.
— Або я, думаеш, збаяўся? —
Гаворыць дзядзька ў хаце храбры: —
А калі што, дык і за жабры.
Паслухаць вас, усе вы хваты!
А ледзь да дзела — душа ў пяты!
Няма чаго мянціць языкам,
А крык, як быў, і будзе крыкам.
— Няхай крычыць і ты крычы!
— Хіба што жабаю ў карчы;
Прынамсі, з гэтакім пасьпехам, —
Міхал аклікнуўся злосьмехам.
Вось так пачнуць казаць, бывала,
Ды з тых размоваў толку мала,
І толькі горш удражніш раны,
І сьвет заткнуць гушчэй туманы.
А пан за службу шчыра браўся,
Па лесе лётаў, прыглядаўся,
Каб дзе заўважыць непарадак —
На гэта вельмі быў ён падак.
Але ён злы быў асабліва,
Як граў у карты нешчасьліва.
Тады яго асьцерагайся,
Як ад заразы ўжо хавайся.
Раз ён віхрыўся, ды няўдала:
Для злосьці стравы бракавала.
Вось у Парэчча пан шыбуе,
Крычыць, Міхала патрабуе,
Каня спыніўшы каля брамы.
Міхал у гэты момант самы
Прыходзіць зь лесу, йдзе да пана.
— Чаму на флянсах у васпана
Сьляды быдлячыя? — пытае,
А сам так скрыва паглядае,
Насупіў твар і зрушыў бровы,
—Былі там панскія каровы ! . . .
Ох, тут лясьнічы як узьесца!
Ну, не знаходзіць сабе месца!
Ды як затупае нагамі!
Крычыць, махае кулакамі,
А вочы тыя, як у зьмея.
Ад злосьці больш яшчэ чарнее,
З астатніх слоў Міхася лае,
З пасады выгнаць пагражае.
Міхал маўчаў, ды нечакана
Ён сам як рушыцца да пана ! . . .
Лясьнічы зразу ўзад падаўся.
— Чаго, пан — гэтак раскрычаўся?
Завошта, пан, мяне так лае?
Згарыць яна няхай, такая
І служба гэта, і пасада,
І гэта крыўда, й гэта зрада,
І гэта панская адплата ! . . .
Няхай яна будзе праклята ! ! ! —
Міхал тут плюнуў, завярнуўся —
Хоць раз, ды добра агрызнуўся!

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Замест фэльетону

Немагчымая рэцэнзыя

Учора Радактар зьвярнуўся да мяне з загадам, каб напісаць рэцэнзыю ао «Беларускім Эмігранце». «Вы, кажа, «лягеры апісалі, Лювэн размалявалі, накадзілі Ангельшчыне і то з лацінскім загалоўкам, далі зусім удалую справаздачу з кангрэсу Руху. Праўда, што апошняй вашай справаздачы мы не зьмясьцілі, але там было за шмат перцу, бюстаў, ды другіх фізычных акцэсорыяў, а да гэтага саракагадовых. — Бачыце, не выпадала, мы на эміграцыі ня можам пазваляць на гумар, ды яшчэ зь перцам. Мы пакліканы цярпець за мільёны. А тут вось „Эмігрант" — тэма . . .»

— Хвілінку. Павошта даўгі ўступ? — перабіваю. Скажэце, ці там шмат вады, бо калі так, пойдзем перш на чарку зь перцам, каб лягчэй было цярпець. — «Прачытаеце — асудзіце, але на чарку пайсьці — ніколі не пашкодзе . . . Пойдзеце, толькі не забудзецеся напісаць, бо хочуць ведаць нашу думку.

«Хочуць ведаць думкі . . .» Ня ведаю чаму, прыпомніўся мне пушкінскі анэгдот, які варта расказаць, бо маладое пакаленьне мала мела нагоды пазнаць Пушкіна. А добра ён вучыў: «суди, дружок, не выше сапога» ! . .

Дык вось-жа раз некалькі афіцэраў задумалі закпіць з Пушкіна у таварыстве і кажуць: «Александр Сяргеевіч, падобна вы моцныя у граматыцы, скажыце, як лепш напісаць: „чалавек, падай вады", ці „чалавек, прынясі вады"? А Пушкін, зірнуўшы на іх, зь месца: „А навошта вам, спадары, пісаць? Вы можаце проста сказаць: гэй, чалавек, гані нас да вадапою!"»

Але, да рэчы. Трэба пісаць рэцэнзыю, значыць, перш трэба чытаць.

Вось пропасьць! Заўсёды у галаву ўпадаюць нейкія дыгрэсыі, і пераважна не на тэму. На пачатку мы успомнілі пра ваду. Старажытныя грэкі вучылі, што усясьвет складаецца з чатырох элемэнтаў: зямлі, паветра, агню, вады. Гэракліт найбольш бачыў вады, і стуль ягонае «панта рэй». Заўважце, што заўсёды паміж адарванай думкай, а актуальнай тэмай можна знайсьці нейкую аналёгію, хаця-бы нацягнутую. Дык, калі-б нашу сытуацыю дацягваць да грэцкай навукі, што-б у нас выпала: Ад зямлі мы адарваныя, з паветра, паводле прыказкі, жыць нельга, з агнём слабавата, бо піхцімся як гнілы корч — астаецца вада. І муцім сваю вадзіцу як можам . . .

Але, дзе-ж рэцэнзыя?

Калісьці, былі публікаваныя мін'ятурныя рэцэнзыі з нашай прэсы. Восьжа пра «Беларускага Эмігранта» было коратка:

«Дай засьнём пад люлі
Містэра Акулі . . .»

Не пагаджаюся! Пратэстую! Сп. Акула зусім добра пісаў і выдаваў. І «Беларускі Эмігрант» ня быў «адзіным, незалежным беларускім часапісам», бо было іх больш . . . Чаму мы да гэтага дайшлі? Дзіўны парадокс! Мы-ж абжываемся, у нас ужо ёсьць «трэцяя сіла» падобна у праекце і «чацьвёртая моц» (хаця-б пятай калоны ня было!) — здавалася-б дубы варочаць, горы перасоўваць, а зышлі на «адзіны» — «Б. Э.» Слабіссімо . . .

Штуттгард, Фюсэн, Вісбадэн і Мюнхэн знаходзяцца блізка адзін ад другога. Дык і якая-ж розьніца? Няма лёгічнага сэнсу пераварачваць усю гэту сечку з чатырох канфэрэнцыяў. Па вошта студыяваць, што аб гэтым другія пішуць, калі можна перапісаць пункты штуттгардзкай, напісаць, што вісбадэнскія і упросьціць справу? Грунт, што падпісаў. Кара Боская з гэтым пісаньнем! Што мы наўчыліся пісаць, хаця не заўсёды граматычна, да рэчы, згодна з лёгікай і праўдай, — але наўчыліся . . . Што праўда дыпляматы цэлымі дзясяткамі гадоў вучацца, каб умець падпісваць, але мы павінны быць вернымі традыцыі. Бо наш беларускі дзядзька, калі прышоў у якуюсь установу, усялякія прыдзіркі ці «опэры» зьнёс із стаіцкім спакоям, але як прышло да падпісваньня — быў кульмінацыйны пункт трагэдыі: ногі і рукі трасьліся, пот ліўся градам, у вачах цямнела і дзядзька быў чуць ня труп . . . Караул! Падпісаў ! . .

Сваей дарогай пра вісбадэнскую канфэрэнцыю трэба было-б напісаць студыюм, бо гэта не спатыканы ў тарговай гісторыі унікат. Заўсёды у такіх выпадках адзін другога надуў і быў з гэтага задаволены, а той, каго надулі — сабачыў і ругаўся. Тут-жа ўсе ўдзельнікі сабачылі: амэрыканцы, рускія усялякай масьці, беларусы, грузіны, азэрбайджанцы — што падпісалі, украінцы — што не падпісалі — адным словам — усе. Хто там каго надуў — да сяньня невядома. Няўдалы плод канфэрэнцыі — СОНР замёр яшчэ у эмбрыянальным стане.

Дык павошта крык?

А што з рэцэнзыяй?

Трэба аддаць справядлівасьць, што не напрасна ў «Б. Э.» так шмат гаворыцца аб патрэбе рэарганізацыі, перарэарганізацыі, рэфармацыі і г. п. Вось-жа нарэшце нешта новае і зусім удалае: зьмешчаны верш Я. Коласа: «О, край родны, край прыгожы ! . .»

Вельмі мне падабаецца і рубрыка «Асабістае», г. зн. рэцэнзыі з шлюбных урачыстасьцяў. Толькі, што аўтар робіць гэта занадта у нэкралёговым тоне. Трэба вясялей.

Ды й зноў-жа зьяўляюцца філязафічныя думкі: што гэта такое гэты акт. На жаль усё яшчэ ня узгодненая астатковая дэфініцыя сужэнства. Адны называюць гэта Аркадыяй, другія пеклам і пішуць дантэйскае «lasciate ogni speranze», трэція уважаюць гэта за порт, што ня здасца быць праўдзівым, бо порт ёсьць па тое, каб туды уплывала некалькі параплаваў. А ёсьць цынікі, што дэфіньююць: «гэта вымена благіх слоў у дзень і дрэнных запахаў у начы . . .»

Але ўзноў дыгрэсыя.

Паўтараю: гэта рубрыка вельмі мне падабаецца.

Чуць не пад кажнай зацемкай у «Б. Э.» подпіс: Япітушка, Япітушка . . .

Калісь сябры Задзіночаных Нацыяў знуджаныя гутарлівасьцю Маліка выдумалі часаслоў: «малікаваць». Ці ня было-б добра і у нашую прыстаралую публіцыстыку увясьці новы тэрмін — «пітушыцца»? З націскам на «ту» . . .

Крыху напудзіў мяне грозны «Адкрыты ліст» у рэдакцыю «Бацькаўшчыны».

Баюся, што рэдактар, чалавек мяккі, дасца стэрарызавацца і выпаўніць што ад яго аўтар дамагаецца, г. зн. памяшчэньня поўнага тэксту нейкага папярэдняга ліста.

Хіба прыдзецца не чытаць некалькіх чарговых нумароў «Бацькаўшчыны . . .»

Страшэнна позна . . . Так сон мяне марыць . . .

Паважаны Спадар Рэдактар «Бацькаўшчыны»! Даруйце, але з вышэй паданых повадаў, не змагу напісаць жаданай рэцэнзыі. З пашанай пссссс . . .

З цыклю: для дзяцей

Слова аб князеуне Лідзе

Шмат старыны незапісанай увечнілася ў людзкой памяці й казкай ходзіць у народзе. Праз годы-стагодзьдзі казаныя словы памешаныя, часамі зблытаныя. Разабраць іх і скласьці значыць адтварыць старыну й яе дзеі.

Знахар Нямко зачараваў князёўну Ліду . . . У дзіцячыя гады кінуў урок і пасяліў яе ў замку залатым на гары ледзяной.

Гара пад неба, замак бы месяц, князёўна, як сонца сьвеціць, зьзяе.

Слова па ўсёй зямлі пра Цуд-Князёўну, Замак-Зьяву, гару тую ўсюды шугае, зьвініць.

Пачулі рыцары слаўныя, важныя, слова пра князёўну Ліду й жад агарнуў чужынцаў. З за сёмай ракі, дзесятай гары зьбегліся плоймаю, ды гукнулі голасам важным: — «Першы, хто ў браму замку дырдою ўдэрыць — замак таго, князёўна Ліда таму.

Скочылі першыя, ражны-дзіды свае высунуўшы, вышай і вышай. Адно-ж гара за высока — не дастаць, лёд — за халодны змарозіў ахвоту.

Кямнейшыя другія наўкруга кружылі, ходу-ўлазу шукаючы, хітрыкі мяркуючы. Ды гара лёдам гладкая шыбае пад неба. Замак высока, высока.

Кружылі, хадзілі, да ўсходу сонца роў-яму, выхадзілі ля гары тае.

Шаптуны трэція загаворы шапталі, сілы чараў прабавалі, заломы ламалі, ды гара сьнежнай сінявою йскрыцца, замак полымям шугае, князёўна льняныя косы зьвівае, у даль-далёкую глядзіць.

Не перамагчы шаптуном сілы чароўнай знахара Нямка. Не сегануць рыцарам важным да брамы залатое. Ня ўсьпяцца воям адважным на гару ледзяную.

Прыходзілі ды малойчыкі. Кволы гуляркі чмуцілі, князёўну нагідоўвалі з гары сысьці, з замку золата зьнясьці.

Ды ня чуе сьпеваў іх князёўна. Ня цяміць гуляркі іх.

Мінаюць зімы, леты, гады, а народ дзівуе: — «Састарэецца князёўна, віна мёду не спазнаўшы, сьвету-шчасьця не відаўшы.»

Ажно аднойчы, раніцою, як на молень верных званы склікалі, у расе вясёлка мыла вочы, замак сьвятынь (аўрэоля) абвадзіла, вітала раніцу князёўна, — тудэма хлопец Ішоў вясковы.

Убачыў князёўну Уселюб, так звалі хлопца тога, і сьціснула любасьць у грудзях хлапцовых, цяга вялікая ўзьнялася.

Успалымнела сэрца Ўселюба пачуцьцём агністым, зазьзялі вочы тугою.

Праз чар-урок, праз даль далёкую пачула князёўна каханьне шчырае й узрадавалася сэрца дзявочае, загарэлася каханьем.

А дзе каханьне, там жар і прысак. Патала гара замку ад жару каханьня й замак асеў на балотах — лёду-ж было процьма.

Добры знахар Нямко ўбачыў велічкаханьня й ня змог устрымацца ад помачы. Кінуў пояс срэбрысты — рака вялікая стварылася. Паліліся воды ў раку, ды балоты асушэлі. Брамы замку падняліся й абняла Уселюба князёўна.

Гукнула слова пра цуд каханьня, зьбегліся людзі з далёку. Вясельле княжае зладзілі. Замак градам абвялі. Ля граду сеў народ вакольны. Места выросла магутнае.

Назваў народ той места: Ліда — так князёўну звалі, раку вялікую Нёман — падзяка знахару нямому за помач каханьню.

Доўга княжылі княгіня Ліда й князь Ўселюб — народ яго князем клікнуў над сабою. Ня гас жар каханьня ў сям'і княжай. А людзі на ўзор маючы прыкладны каханьнем урок лёду чаравалі.

Доўга жылі Уселюб — Ліда. Дзяцей рослых дачакаліся. Адно-ж мор паў на зямлю Прынямонскую. Мерлі людзі асенькімі мухамі. Як траву ўсіх сьмерць касіла. У Морыні ўсё селішча вымерла, бяз нашчадка, бяз званьня, дзеля таго дасюль сяло так завецца.

Не памінула пошасьць Лідзкага замку. Аўдавеў князь Ўселюб.

Днямі-начамі хадзіў ён па замку, жаль-жалючы, па Лідзе галубцы галосячы. Але сьмерці галашэньнем не вярнуць.

А места зноў большала, люднела, ды каханьне гарэла ўсюды. І ня зьдзержаў князь успаміну. Кінуў княства сыну Любку, што Любчу потым заснаваў. Напасажыў дачку Іўю, што у Іўі потым век зжыла. Надзяліў ён сына Орліка, што над Нёмнам Ворлю размясьціў. Забясьпечыў малую Беліцу, што вялікай князёўнай ведамая ў Беліцы.

А сам падаўся ў бор занямонскі ды асеў самоскай адзінокім у бары, аж пакуль сьмерць, ратавальніца з гора, яго ня вызваліла.

Даведаліся людзі зь Ліды пра сьмерць князя Ўселюба ў бары Занямонскім. Пешкі хлынулі туды, шлях шырокі пралажылі. Паховіны зьдзеялі князю прадаўнія. Тры дні й тры ночы там хаўтаравалі. Ад хаўтурных-жа вогнішчаў бор заняўся й гарэў, доўга гарэў. Пажар-жа здаўся вельмі ўрадлівы. Сяляне на пажары пасяліліся, ды селішча Ўселюб назвалі.

Княжыць Любко ў замку Лідзкім, княжы род мацуе. Ад замку цячэ рэчка ў Нёман раку. Халодная рэчка з пад гары замкавай лядзяной таму Лядзейкай завецца. Да сяньня ўрочы лёд пад замкам трывае ды ад жару каханьня тае.

Кажуць: — «Урок дзее ў зямлі нашай. Як ня стане каханьня ў Лідзе, места лёдам зяледзянее, шыбане гара пад неба. А як ня стане сялян ува Ўселюбе, спапялеюць сяла хаты, борам Ўселюб зарасьце.»

Адно ўжо другой князёўне Лідзе ня бываць.
Адно ўжо другому хлопцу не кахаць.
Зьвяліся князі на зямлі Прынямонскай.
Змарнелі дзяцюкі ў вёсках нашых.

Склаў Барыс Юч

Тыдзень малітвау за хрысьціянскую еднасьць

У сувязі з «Тыднем малітваў за хрысьціянскую еднасьць», які адбыўся паміж 18 і 25 студзеня г. г., хор Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне даў цэлы шэраг выступаў з праваслаўнымі царкоўнымі песьнямі ў розных касьцёлах Бруксэлі.

Першым з такіх выступаў была цэлая Божая служба ў бізантыйскім абрадзе, адпраўленая ў нядзелю 20 студзеня ў перапоўненым вернікамі касьцеле Нотрэ-Дамэ у Ляекен а. а. Бэнэдыктынцамі і адсьпяваная ўспамянутым хорам. Вечарам гэтага-ж дня Беларускі Студэнцкі Хор адсьпяваў паўторна некалькі царкоўных песьняў у касьцеле Сан-Жульен (Бруксэля-Аўдэргем).

У аўторак, дня 22 студзеня адбыўся 3-ці выступ у касьцеле сьв. Пятра (Бруксэля-Андэрлехт), пасьля якога харыстым было зроблена прыгожае прыняцьце.

Найгалаўнейшы і апошні выступ меў месца дня 25. І. у касьцеле Сан-Гэнры ў прысутнасьці папскага нунцыя Монсіньёра Чэнто.

Апрача чыста рэлігійнага значэньня гэтыя выступы маюць таксама і нацыянальнае. У кажным касьцеле тысячы прысутных чулі з вуснаў сваіх сьвятароў шматразова паўтараныя словы падзякі беларускім студэнтам за сапраўды мастацкае выкананьне царкоўных песьняў. Беспасярэднім насьледкам гэтых выступленьняў і іх высокай ацэнкі знатакамі ёсьць запросіны хору Б. С. З. на канцэрт у Бруксэлі, які мае адбыцца ў памешканьні каледжу Сакрэ Кэр дня 10 лютага 1952 г.

А. А.

Агульны гадавы зьезд беларусау у Бэльгіі

У нядзелю 3 лютага г. г. ў Лювэне адбыўся Агульны Зьезд сяброў СБ у Бэльгіі. Зьезд распачаўся а 9 гадзіне Божай Службай, адпраўленай у беларускай праваслаўнай капліцы сьвятаром ВАПЦ а. А. Смаршчком. А гадз. 11-ай усе ўдзельнікі перайшлі ў залю паседжаньняў пры пляцы Гувэра 22.

На пачатак хор БСЗ прасьпяваў некалькі беларускіх народных і нацыянальных песьняў, пасьля чаго Зьезд быў афіцыяльна адчынены старшынёй СББ сп. інж. Я. Жытком. У кароткіх словах накрэсьліў усю гісторыю СББ ад пачатку яго заіснаваньня.

Цяжкія матарыяльныя ўмовы, недахоп інтэлектуальных сілаў, нявысокая нацыянальная сьведамасьць беларускіх масаў у Бэльгіі былі вялікім тормазам у разьвіцьці арганізацыі. Аднак-жа дзякуючы ахвярнай працы і самаадданасьці справе некаторых адзінак, а асабліва сп. У. Рыжы-Рыскага, арганізацыя даволі добра наладзіла сваю працу і ў палове 1948 г. была бэльгійскімі ўладамі залегалізаваная. Прыбыцьцё зь Нямеччыны першае групы студэнтаў (канец 1948 г.), групы, якая заўдзячае шмат СББ, падмацавала СББ і яшчэ больш зактывізавала ягоную працу. Арганізацыя набрала размаху й ейны аўтарытэт сярод работнікаў узьняўся. Далей на прапанову старшыні сп. інж. Жытко была выслана ад імя Агульнага Зьезду прывітальная тэлеграма сп. У. Рыжы-Рыскаму. Усьлед Зьезд прыступіў да выбару прэзыдыюму, старшынёю якога быў выбраны сп. А. Марговіч, а сакратарамі сп. сп. Цьвірка і Я. Запруднік.

З прачытаных справаздачаў зь дзейнасьці Ураду СББ, Фінансавага і Сацыяльнага Рэфэрэнтаў было ясна відаць, што Галоўная Ўправа СББ добра вывязвалася із сваіх абавязкаў. За справаздаўчы пэрыяд было завэрбована ў рады арганізацыі шмат новых сяброў, было праведзена сябрамі Галоўнай Управы, спэцыяльнымі дэлегатамі, або асабіста Сацыяльным Рэфэрэнтам а. Смаршчком панад 40 выездаў у паасобныя аддзелы СББ, ды ў розныя ўстановы Бруксэлі. Мэтай выездаў на правінцыю было чытаньне для сяброў СББ рэфэратаў на беларускія нацыянальныя тэмы, на сацыяльныя тэмы, арганізаваньне важнейшых нацыянальных урачыстасьцяў і дапамога работнікам перад мясцовымі ўладамі.

У дыскусыях выявілася таксама, што ў сувязі ізь зьменай кальпартэра, кальпартаж «Бацькаўшчыны» праводзіўся дрэнна. Зьмена кальпартэра наступіла дзякуючы прыватнай ініцыятыве некаторых прыватных асобаў без пасярэдняга паразумленьня з Галоўнай Управай СББ, якая ёсьць адказнай за рассылку прэсы.

Агульны Зьезд на прапанову Рэвізыйнай Камісыі удзяліў абсалюторыюм з падзякай Галоўнай Управе і з асабістай падзякай сп. В. Кіпелю, які ўлажыў шмат працы, ды выбраў новую Галоўную Управу ў наступным складзе: Старшыня — а. А. Смаршчок, заст. старшыні В. Кіпель, сакратар — сп. П. Урбан, скарбнік — сп. М. Ягаўдзік, сацыяльны рэфэрэнт — сп. М. Смалонскі.

Пасьля спрэчак над плянам працы на бягучы год, Зьезд забавязаў Галоўную Ўправу праводзіць далей выезды да работнікаў на правінцыю, чытаць там рэфэраты на нацыянальныя, сацыяльныя ды літаратурныя тэмы, ды больш актыўна цікавіцца беларускім работніцкім жыцьцём у Бэльгіі.

Далей Зьезд выняс пастанову аб заснаваньні беларускага фонду дапамог. інвалідам і выкананьне гэтае пастановы даручыў Галоўнай Управе.

На заканчэньне ад імя ўсіх удзельнікаў Зьезду была выслана прывітальная тэлеграма сп. Прэзыдэнту Рады БНР інж. М. Абрамчыку.

Зьезд закончыўся супольным адсьпяваньнем нацыянальнага гымну.

А. А.

Мае пажаданьні „Бацькаўшчыне"

(Заканчэньне з папярэдняга нумару)

Адно з найвялікшых заданьняў нашага эміграцыйнага друку — вызваліць нашую мову з таго палону й занядбаньня, у якім яна апынулася пад савецкаю «апекаю» там, на роднай Беларусі. Мы мусім ісьці шляхам, які нястомна й паважна церабілі-карчавалі ўзвышэнцы, няшчадна адкідаючы ўсё чужацкае, гэтае наплылае ці накінутае з хіжацкай мэтаю ланцужнымі прыблудамі, каб засьпіць ды ўсымерціць нашае нацыянальнае.

Мы мусім ачышчаць — бараніць нашую мову ад гэтае труізны — ды ці адно мову! — і бараніць гэтак паважна ад усяго чужацкага, каб, як кажа наш народ, — і духу яго ня было!

Дык няхай спорыць у працы!

Язэп Менскі

АД РЭДАКЦЫІ: Заўвагі й пажаданьні, выказаныя у вышэй надрукаваным артыкуле сп. Я. Менскага, адносяцца ў васнаўным да Рэдакцыі «Бацькаўшчыны». Тым ня менш, аднак, яны будуць цікавымі й карыснымі для шырэйшых колаў нашых чытачоў, у першую чаргу для тых, для якіх справа належнае узроўні нашае газэты ляжыць таксама на сэрцы. Таму мы й знайшлі патрэбным змясьціць гэты артыкул на балонах «Бацькаўшчыны».

Крытычныя заувагі паважанага Аўтара аб нашай газэце ў васнаўным правільныя. Аўтар між іншым піша: «Галоўная загана газэты — абмяжаванае кола супрацоўнікаў». Вось-жа мусім зазначыць, што гэтае «кола супрацоўнікаў» у запраўднасьці яшчэ больш абмежаванае, чымсьці нат' уяўляе сабе паважаны Аўтар. І гэтая, зусім ад нас незалежная, загана газэты родзіць і ўсе іншыя заганы, пералічаныя ў артыкуле.

Нам таксама, як і паважанаму Аўтару, «хацелася-б, каб газэта была яшчэ лепшай і што да зьместу і што да вонкавага выгляду». Але гэтага адна Рэдакцыя зрабіць ня ў сілах без актыўнага ўдзелу шырэйшых колаў нашага грамадзянства, галоўна публіцыстых і прадстаўнікоў літаратурнага сьвету.

Дык да добрае волі ўсіх гэтых людзей яшчэ, і ўжо ці каторы раз, гэтта апэлюем.

АД РЭДАКЦЫІ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»

Таму, што 17 лютага «Бацькаўшчына» не паявілася, гэты нумар выдаём падвойным. Таксама й некаторыя наступныя нумары будуць падвойныя. У сувязі з гэтым просім усіх нашых Прадстаўнікоў і Кальпартэраў прадаваць іх таксама выключна па падвойнай цане.

УВАГА, БЕЛАРУСЫ БЭЛЬГІІ!

Дня 16 сакавіка 1952 г. адбудзецца ў Лювэне (19, пляц Гувэра) 2-гі Агульны Зьезд сяброў Згуртаваньня Беларускі Камбатантаў Бэльгіі. Зьезд распачнецца Божай Службай а 8,30 гадзіне.

Парадак дня наступны:

1. Адкрыцьцё Зьезду.
2. Выбары Прэзыдыюму Зьезду.
3. Рэфэрат на актуальныя тэмы.
4. Адчытаньне пратаколу папярэдняга Зьезду.
5. Справаздача Старшыні Галоўнай Управы й Старшыняў мясцовых аддзелаў.
6. Дыскусыя над справаздачамі.
7. Выбары Галоўнай Управы на бягучы год.
8. Вольныя прапановы.

Пасьля супольнага абеду адбудзецца камбатанцкая вечарына (гумарыстычныя выступленьні, песьні, танцы й т. п.).

Заклікаюцца ўсе сябры ЗБК прыбыць у як найбольшай колькасьці на Зьезд. Пры гэтым паведамляецца, што на Зьезд будзе запрошаны сп. Прэзыдэнт БНР інж. М. Абрамчык.

Управа ЗБК

НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»

На Выдавецкі Фонд «Бацькаўшчыны» й на «Белую Кнігу» злажылі:

1. Беларусы з Новага Брансьвіку (ЗША) 3.953 бэль. фр.
2. Сп. Д. Яцкевіч (Аўстралія) 552 бэль. фр.
3. Сп. Кучура (ЗША) 240 бэль. фр.
4. Сп. Др. Я. Станкевіч (ЗША) 514 бэль. фр.
5. Беларусы з Клевленд (ЗША) 1.602 бэль. фр.

Усяго: 6.861 бэль. фр.

Прадстаўніцтвы „Бацькаўшчыны"

ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. **У Бэльгіі:**
   Mr. Karas Leonid, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:**
   The Whiteruthenian Editorial Foundation 32, Penn Road, **London, N. 7. England.**
3. **У Францыі:**
   Mr. Symaniec Vladimir, 15, rue du Ltn. Boncour, Neuilly s/Seine, France.
4. **У ЗША:**
   Mr. B. Danilovich,
   222 Suydam St. New Brunsvick, N. J..U. S. A.
5. **У Канадзе:**
   Mr. Joseph Corny, 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:**
   Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:**
   Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street, East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:**
   Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:**
   Mr. Karanieuskj Marjan, Burns Izonsc, Mosgiel, New Zeeland.

Непастрэдна з гэтых прадстаўніцтваў просім суродзічаў выпісваць «Бацькаўшчыну» і там-жа разьлічвацца за газэту.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў у Нямеччыне грошы за «Бацькаўшчыну» з усіх краінаў паза Нямеччынай просім перасылаць на наступны адрас:

Mr. Jan Zaprudnik,
19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011